Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ЧАЦВЕР №192 (28556)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Паўсотні сабак і добрае сэрца**



**Як не згубіць дзіця**





**Працоўнае права ў адказах**

СТАР. 4

*ЛІЧБА ДНЯ*

**426 млн рублёў**

*накіруюць банкі ў 2018 годзе на крэдытаванне жылля па праграме адраснага субсідавання. Крэдыты на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых памяшканняў, частка працэнтаў за карыстанне якімі і (або) асноўны доўг па якіх выплачваецца грамадзянамі за кошт субсідый, будуць выдавацца Беларусбанкам, Белаграпрамбанкам, БПС-Ашчадбанкам і Белінвестбанкам. У 2017 годзе аб'ём крэдытных рэсурсаў, што выдзяляюцца для гэтых мэт названым банкаўскім установам, складзе 209 млн рублёў. Адрасныя субсідыі могуць выдзяляцца як на выплату часткі працэнтаў па крэдыце, так і на пагашэнне асноўнага доўгу.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9650 | ▼ |
| Еўра | 2,3111 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0340 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0733 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X





# Паром і ровар

Для жыхарак горада Дзісна Мёрскага раёна гэта самыя надзейныя транспартныя сродкі, прынамсі, пакуль надвор'е дазваляе. Жанчыны працуюць у суседнім Верхнядзвінскім раёне ў пасёлку Луначарскае — у пансіянаце для інвалідаў, які знаходзіцца на другім беразе самай вялікай ракі на поўначы краіны — Заходняй Дзвіны. Кожны дзень, пераадолеўшы на пароме раку, яны сядаюць на свае веласіпеды і спяшаюцца на дзяжурства, а пасля гэтаксама вяртаюцца дадому, у Дзісну.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Харчовая бяспека

## Фінансавы бар'ер для гародніны,

### або Чаму нельга кантраляваць мікраклімат цяпліц фортачкай

**По ўсёй краіне па суботах прапануюць прадукты новага ўраджаю сельскагаспадарчыя кірмашы. Яны ўжо сталі традыцыйнымі і карыстаюцца папулярнасцю ў беларусаў. Усе ахвотныя тут могуць не толькі купіць па добрай цане садавіну і гародніну, мяса і рыбу, але і далучыцца да духу масавых гулянняў. Як кажуць: і хлеб, і відовішча. Але людзі хочуць есці свежыя плады круглы год, а не толькі ў сезон кірмашоў. І для гэтага зусім не трэба ўмець кантраляваць сусветны клімат. Побач са сталіцай ёсць цяплічныя гаспадаркі, дзе гародніну вырошчваюць незалежна ад сезона. Адсюль яна трапляе на прылавак праз некалькі гадзін пасля таго, як яе знялі з градкі. Прадпрыемства паспяховае і запатрабаванае. Аднак шматлікім цяпліцам тут па 30 гадоў. Напярадзе ў мінскай фабрыкі гародніны нямала работы па мадэрнізацыі. І банкі тут — не памочнікі. Як жа быць?**



### ЗЕЛЯНІНА КРУГЛЫ ГОД

Калі заходзіш у велізарную цяпліцу сталічнай фабрыкі гародніны, зусім забываеш, што на вуліцы 8 градусаў цяпла — тут заўсёды свая атмасфера і тэмпература. Зялёны колер памідораў, якія яшчэ толькі растуць, моцна кантрастуе з жоўтым лісцем за акном. Супрацоўнікі кажуць, што раз у год на 2—3 тыдні кожную цяпліцу цалкам чысцяць, каб правесці неабходныя тэхнічныя работы, а затым зноў — буйны рост.

Мінская агароднінная фабрыка з'яўляецца шматпрофільным прадпрыемствам. Тут займаюцца вытворчасцю збожжа (каля 10 тысяч тон у год), ёсць уласны яблычны сад, які раскінуўся на 118 га, вырабляецца мяса і малако. Ёсць нават цэх па перапрацоўцы лекавых раслін і вытворчасці чайных напояў. Аднак асноўным кірункам гаспадаркі з'яўляецца вытворчасць агародніны на закрытым і адкрытым грунце — каля 56% валавога прадукту. Прычым у цяпліцах вырабляюць 8,5 тысячы тон гародніны, а ў адкрытым грунце — 3,5 тысячы тон. Акрамя таго, прадпрыемства экспартуе каля 30% сваёй прадукцыі ў Расію. У цэлым задачу па забеспячэнні беларусаў гароднінай круглы год тут выконваюць эфектыўна. Пакуль што.

СТАР. 2

■ Культурная спадчына

## МУЗЕЙ З ІНТЭРАКТЫВАМ

### Чым будзе здзіўляць музей Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве

**Гэты двухпавярховы асабняк канца XVII стагоддзя — адзін з найстарэйшых будынкаў горада. На яго каванай металічнай агароджы вось ужо чацвёрты год вісіць замок — ідзе капрамонт. Але нядаўна на пашпарце аб'екта паявілася дата яго здачы — верасень 2018 года. На завяршэнне аб'екта з Фонду Прэзідэнта выдзелена больш за паўмільёна беларускіх рублёў. Карэспандэнт «Звязды» паназірала за ходам работ і разам са спецыялістамі ацаніла тыя перамены, якія адбыліся дзякуючы рэканструкцыі.**

**Музей амаль гатовы.**



Стыльны і ўрачысты на выгляд, гэты дом ведае шмат таямніц. Дакладна вядома, што ён пэўны час належаў купцам Аношкам, а потым хто ім толькі не карыстаўся. Краязнаўцы звязваюць з ім эпахальныя падзеі, кажуць, што тут у розныя часы кватаравалі першыя асобы розных дзяржаў. Захаваліся звесткі, што пасля разгрому рускімі Рэчы Паспалітай імператрыца Кацярына II і аўстрыйскі імператар Іосіф II у маі 1780 года падпісвалі ў гэтым доме намер аб раздзеле сфер уплыву ў Польшчы і Літве. У савецкі час будынак у стылі позняга барока і ранняга класіцызму на адной з цэнтральных вуліц Магілёва многім рэзаў вока, але ж, нягледзячы на ўсё, захаваўся.

СТАР. 13

■ Калі мары здзяйсняюцца

# КАРОВА Ў ПАДАРУНАК



**Шматдзетная сям'я Снігір з вёскі Ясень Асіповіцкага раёна атрымала ў падарунак ад Прэзідэнта карову па мянушцы Белка. Урачыстае ўручэнне адпаведнага сертыфіката і самой «карміцелькі» па даручэнні кіраўніка дзяржавы і ўрада прайшло ўчора з удзелам першага намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алега Чыкіды.**

Як паведамляе БЕЛТА, з незвычайнай просьбай аб карове звярнулася на афіцыйны сайт кіраўніка дзяржавы гаспадыня сям'і Вольга Снігір, матывуючы гэта неабходнасцю і патрэбай забеспячэння дзяцей свежым малаком. Доўга чакаць не прыйшлося. Пра тое, што ліст дайшоў да адрасата, паведамілі работнікі сацыяльнай службы, якія прыехалі літаральна праз тыдзень абследаваць умовы пражывання сям'і і магчымасць утрымання кароўкі.

«Гэта правільная і своечасовая просьба, — адзначыў, уручаючы сертыфікат на Белку, Алег Чыкіда. — Дзецям патрэбна здаровае і правільнае харчаванне. Даведаўшыся пра жаданне сям'і, кіраўнік дзяржавы даручыў аказаць падтрымку. З гэтай мэтай і была



Фота БЕЛТА.

набыта мясцовай гаспадаркай «Ясень-АГРА» карова, якая дае ў суткі 25 кг малака. Гэтага хопіць, каб забяспечыць шматдзетную сям'ю свежым малаком і гатаваць з яго розныя хатнія прадукты: тварог, смятану, вяршкі і іншыя».

Па словах Алега Чыкіды, карова прайшла пэўны кастынг: выбіралі, каб яна была прадукцыйная, здаровая, спакойная. Да таго ж карова цельная, таму ў лютым-сакавіку будзе папаўненне. Акрамя таго, каб аблегчыць працу шматдзетнай маме, першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама ўручыў ёй даільны апарат, а таксама перадаў у падарунак двух'ярусны дзіцячы ложак, ноўтбук і прысмакі.

У адказ Вольга Снігір падзякавала ад імя ўсёй сям'і за такі каштоўны і важны падарунак Прэзідэнту і перадала таксама ў дар сямейнае фота і дзіцячыя вырабы. Доўгачаканую Белку яна паабяцала берагчы і песціць, а ў самы найбліжэйшы час навучыцца рабіць з малака ўсякія смачнасці. Даіць карову жанчына ўмее, навучылася, калі жыла з мужам у свекрыві ■

■ Блізкая ўлада

# Бізнес і дэмаграфія

## Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае праводзіць выязныя прыёмы ў рэгіёнах

**Пакет дакументаў па развіцці прадпрымальніцтва будзе падпісаны ў найбліжэйшы час, паведаміў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Мікалай СНАПКОЎ пасля прыёму грамадзян у Ляхавіцкім райвыканкаме (Брэсцкая вобласць).**



Фота БЕЛТА.

Як паведамляе БЕЛТА, Мікалай Снапкоў таксама заявіў аб неабходнасці прымаць дадатковыя меры для стымулявання нараджальнасці ў Беларусі. На прыём да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прыйшла маці пяцярых дзяцей з просьбай аб прадастаўленні дадатковых ільгот шматдзетным сем'ям. Мікалай Снапкоў адзначыў, што гэтае пытанне неабходна разгледзець, бо стварэнне ўмоў для стымулявання нараджальнасці з'яўляецца найважнейшай задачай.

«Мы цяпер рыхтуем для Прэзідэнта інфармацыю па стымуляванні нараджальнасці. Адзначаем, што быў невялікі дэмаграфічны ўздым, а цяпер тэндэнцыя да спаду. Трэба рабіць нейкія больш радыкальныя крокі па стымуляванні нараджальнасці», — сказаў ён.

Таксама на прыём звярнуўся жыхар Ляхавіцкага раёна па пытанні газіфікацыі трох вёсак — Дайнякі, Карані, Тумашы — з просьбай аб садзейнічанні ў рэалізацыі гэтага праекта. Мікалай Снапкоў абяцаў узяць гэтае пытанне на кантроль.

Падчас прыёму грамадзяне звярталіся да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта па пытаннях прыватызацыі жылля, пенсій, жыллёва-камунальных паслуг і інш. Сярод ахвотных былі не толькі жыхары Ляхавіч і Ляхавіцкага раёна, але таксама Баранавіч, Баранавіцкага і Лунінецкага раёнаў. Усе звароты ўзяты Мікалаем Снапковым на кантроль. Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае праводзіць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах ■

# Фінансавы бар'ер для гародніны

## ПЫТАННЕ ЗАСТАЕЦЦА АДКРЫТЫМ

Сёння на фабрыцы цяпліцы займаюць 18,5 га. З іх практычна палову трэба знесці. Многія з цяплічных комплексаў будаваліся яшчэ ў 80-х гадах мінулага стагоддзя. Прадпрыемству таксама патрабуецца мадэрнізацыя. Як расказала **галоўны тэхнолаг Ніна БАЛАШЭНКА,** на фабрыцы вялікая колькасць цяпліц 1—3-га пакалення, няшмат 4-га, апошня з якіх узводзіліся яшчэ ў 2009 годзе.

«Сёння патрабуюцца цяпліцы 5-га пакалення. У Расіі ўжо ёсць прадпрыемства, на якім пабудаваны сучасны закрыты грунт. Нягледзячы на тое, што наша прадукцыя там сёння цэніцца, без неабходнай мадэрнізацыі можна ў хуткім часе страціць свае пазіцыі», — хвалюецца Ніна Балашэнка.

Розніца пакаленняў істотная: у першых цяпліцах няма штор, не прадугледжваецца асвятленне раслін, адсутнічае штучны туман, які патрэбны, напрыклад, для агурка. Новыя цяпліцы дапамагаюць эканоміць газ і маюць палепшаныя цеплаізаляцыйныя характарыстыкі. Таксама прадугледжваецца і камп'ютарная аўтаматыка, за кошт якой кантралюецца тэмпература. Рэгулявань фортачкай мікраклімат у цяпліцах — азначае ў хуткім часе адстаць ад канкурэнтаў.

З прычыны таго, што новыя цяпліцы 5-га пакалення ўсё менш залежаць ад знешніх фактараў, яны не з танных. Акрамя таго, па словах **дырэктара Уладзіміра ПАРЧЭЎСКАГА,** каб рэнтабельна працаваць, неабходна штогод абнаўляць 2 га цяпліц. «Таксама варта задумацца і аб пашырэнні. Сёння плошчы дазваляюць павялічыць аб'ём цяплічнага комплексу да 25 га», — дадаў дырэктар. Але на ўсё гэта патрэбныя грошы. І немалыя. Банкаўская сістэма тут не памочнік — эканамісты прадпрыемства пралічылі, што крэдыты браць ім не выгадна. Асабліва надзеі ўскладаюцца на інвестыцыйную праграму Мінска на 2018 год, у якую трапіць прадпрыемству сёння жыццёва неабходна.

## СКЛАД НОН-СТОП

У заключэнне хацелася б крыху адысці ад цяпліц. За харчовую бяспеку ў краіне адказваюць не толькі прадпрыемствы, якія вырошчваюць гародніну, але і тыя, што яе захоўваюць. Без іх карціна будзе не поўнай. Адна з такіх арганізацый — гандлёва-закупачнае прадпрыемства «Партызанскае». У міжсезонне дзяржаўныя гандлёвыя арганізацыі могуць знайсці свежую гародніну і садавіну менавіта тут. Сёлета ў стабілізацыйны фонд Мінска будзе нарыхтавана 15 тысяч тон бульбы, 17,5 тысяч тон агародніны і 4 тысячы тон яблыкаў. Прычым 97,3% нарыхтоўкі гэтых прадуктаў прыпадае на «Партызанскае». Для захоўвання тут ёсць 12 сховішчаў, якія адпавядаюць усім неабходным патрабаванням. Агульная іх ёмістасць складае 67 тысяч тон. Закупляюць прадукцыю ў тым ліку і ў фермераў з усёй краіны. Яе закладка будзе забяспечана ў поўным аб'ёме да 15 лістапада, і да 31 мая па графіку яе будуць размяркоўваць. Гандаль агароднінай сёлета абяцаюць стабільны і бесперабойны.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# КРОКІ НАСУСТРАЧ

**У Андоры-ла-Веле (Княства Андора) праходзіць восенськае пасяджэнне Парламенцкай асамблеі АБСЕ. У рабоце асамблеі прымае ўдзел парламенцкая дэлегацыя нашай дзяржавы пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу ў ПА АБСЕ Баляслава Пірштука.**

Як паведаміла прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, Баляслаў Пірштук выступіў у дэбатах па тэме «Абмеркаванне праблем кібербяспекі». Ён заклікаў разглядаць праблему рэагавання на выклікі і пагрозы ў галіне кібербяспекі скрозь прызму агульнай сітуацыі ў сферы бяспекі на прасторы АБСЕ.

Віцэ-спікер ніжняй палаты беларускага парламента таксама нагадаў калегам аб ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі, выказанай на сесіі ПА АБСЕ ў Мінску, пра неабходнасць абнаўлення Хельсінкскага працэсу ў інтарэсах міру і бяспекі ў Еўропе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

■ Як бывае

# У Прэзідэнта Грузіі ўрадзіла беларуская бульба

**Пра гэта Георгій Маргвелашвілі расказаў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Facebook. Ён таксама дадаў фота самога працэсу ўборкі — на яго, Прэзідэнта, прысядзібным участку.**

«Жадаю ўсім ураджайнай восені! Выкарыстоўваючы беларускую пасяўную бульбу, мы атрымалі ў адведзеныя тэрміны велізарны ўраджай: з аднаго мяшка бульбы — шэсць. Дзякуй сябрам!», — сказана ў подпісе да фатаграфій.



Бульбу, якую высаджвае на сваім участку Прэзідэнт Грузіі, ён атрымаў ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Праўда, у папярэднія гады ён быў засмучаны ўраджаем. У лютым у эфіры беларускага тэлебачання Прэзідэнт Грузіі расказаў, што захапляецца сельскай гаспадаркай і сёе-тое вырошчвае ў сваім агародзе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*
**Фота з акаўнта Прэзідэнта Грузіі ў Facebook** ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Трамп заявіў, што цяпер не час для дэбатаў па пытанні аб свабодным продажы зброі

«У нейкі момант, гэта, магчыма, адбудзецца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але не цяпер». Зададзенае журналістамі пытанне Трампу датычылася трагедыі, якая здарылася ў Лас-Вегасе. У нядзелю ўвечары на канцэрце непадалёк ад гасцінічна-забаўляльнага комплексу Mandalay Bay адбылася стральба. Па звестках паліцыі, агонь з 32-га паверха атэля вёў 64-гадовы жыхар Невады Стывен Пэдак. Ён пакончыў з сабою да прыбыцця паліцыі. Ахвярамі трагедыі, паводле апошняй інфармацыі, сталі 59 чалавек, больш за 520 пацярпела. Трамп назваў стральбу ў Лас-Вегасе «актам абсалютнага зла». Прэзідэнт абвясціў аб рашэнні зрабіць паездку на месца трагедыі, каб сустрэцца са сваякамі ахвяр і супрацоўнікамі праваахоўных органаў, якія першымі прыйшлі на дапамогу людзям, што трапілі пад абстрэл.

## Кіраўнік Каталоніі: мы аб'явім аб незалежнасці ў найбліжэйшыя дні



Каталонія абвесціць незалежнасць ад Іспаніі ў найбліжэйшыя дні. Пра гэта ў інтэрв'ю BBC заявіў кіраўнік рэгіёна Карлес Пучдэмон. Пучдэмон у сваім першым інтэрв'ю пасля рэферэндуму растлумачыў, што ўрад рэгіёна выдасць адпаведны ўказ да канца гэтага тыдня альбо да пачатку наступнага. Ён адзначыў, што цяпер паміж Мадрыдам і ўладамі Каталоніі няма кантакту. Калі яго спыталі, што ён будзе рабіць у выпадку спробы іспанскіх уладаў узяць пад кантроль урад Каталоніі, Пучдэмон адказаў, што гэта стане «памылкай, якая зменіць усё». Учора кароль Іспаніі Феліпэ VI абвінаваціў уладу Каталоніі ў недапушчальнай нелаяльнасці і парушэнні канстытуцыі краіны. «Яны ў яснай і рашучай манеры паставілі сябе па-за законам і дэмакратыяй. Яны спрабавалі зламаць адзінства Іспаніі і яе нацыянальны суверэнітэт», — заявіў манарх. Рэферэндум аб незалежнасці Каталоніі ад Іспаніі прайшоў 1 кастрычніка. Больш за 90 працэнтаў тых, хто прагаласаваў, выказаліся за незалежнасць аўтаноміі. Цэнтральная ўлада каралеўства ўсяляк спрабавала перашкодзіць правядзенню рэферэндуму. У прыватнасці, у Барселоне супраць пратэстуючых паліцыя ўжыла гумавыя кулі. Усяго ў ходзе сутыкненняў пацярпелі 893 удзельнікі рэферэндуму і 33 паліцэйскія.

## Рабаўнікі патрацілі мільён долараў на тунэль да банка. Іх затрымалі, калі амаль усё было гатова

У Сан-Паўлу затрыманыя 16 падазраваных, якія збіраліся абрабаваць банк Бразіліі. Каб дабрацца да сховішча банка, злачынцы пракапалі тунэль даўжынёй 600 метраў. Акрамя таго, злачынцы ўмацавалі тунэль металічнымі стойкамі і нават правялі ў ім электрычнасць. Тэлеканал Globo паведаміў, што на падрыхтоўчыя работы яны патрацілі каля 4 мільёнаў бразільскіх рэалаў (прыкладна 1,3 мільёна долараў). Па звестках паліцыі, падрыхтоўку да аграблення злачынцы планавалі завяршыць да серады, 4 кастрычніка. Іх затрымалі ў выніку аперацыі, праведзенай у панядзелак. Дзяржаўны банк Бразіліі — найбуйнейшы і найстарэйшы ў краіне. Рабаўнікі збіраліся вынесці з яго 1 мільярд рэалаў (больш за 300 мільёнаў долараў). У выпадку поспеху гэта рабаванне стала б самым буйным у гісторыі Бразіліі.

■ Дажынкі-2017

# Стравы з дзічыны, шахматы з пернікаў

## і іншыя дзівосы чакаюць удзельнікаў свята

**Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі-2017» адбудзецца 7 кастрычніка ў Смалявічах. Арганізатары абяцаюць зрабіць яго відовішчным і непаўторным.**

Дзвесце суб'ектаў гаспадарання прывязуць свае тавары, прадукты на свята. Пакупнікоў чакаюць зніжкі ад вытворцаў, акцыі. Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў прапануе стравы з дзічыны і рачной рыбы. Дзяцей чакае «Салодкі фэст». Кандытары прыгатуюць для маленькіх гурманаў бісквіты, марожанае, іншыя ласункі. У гастранамічнай зоне можна будзе пакаштаваць папулярныя стравы нацыянальнай кухні. У «Сырнай сядзібе» ёсць шанц выйграць цэлую галоўку сыру: дастаткова адолець лабірынт або падняць штангу.

Будзе таксама працаваць выстаўка-кірмаш Барысаўскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы: лаўка абразоў, царкоўных прылад і кніг, а таксама манастырская лаўка з прадукцыяй асабістай вытворчасці (мёд, малочныя вырабы, гародніна, выпечка).

На «Свяце хлеба» чакаюць сапраўдных гросмайстраў: шахматныя партыі тут разыграюць фігурамі з пернікаў. На пляцоўцы «Каравайная» будуць выстаўлены караваі ўсіх раёнаў Міншчыны, у тым ліку галоўны абласны каравай.

Аматарам піва афіцыянты прапануюць новыя гатункі пеннага напою. Установы прафесійнай адукацыі прадставяць прадукцыю вучнёўскіх бізнес-кампаній, гаспадарак.

Пасля ўрачыстага адкрыцця Маладзёжнага цэнтра пачнецца шэсце «А ў нас сёння «Дажыначкі».

Галоўная дзея — узнагароджанне перадавікоў — пачнецца а 14-й гадзіне. Затым — выступленні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці Міншчыны і прафесійных выканаўцаў. У тым ліку Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г. Цітовіча, сольны канцэрт Дзмітрыя Калдуна. Завершыцца мерапрыемства святочным феерверкам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ На слыху

# «Польскі след» зніклага ў Белавежжы хлопчыка?

## Суседзі шукаюць сведак сустрэчы кіроўцы і невядомага дзіцяці

**У сродках масавай інфармацыі са спасылкай на польскіх калег з'явілася навіна, якая можа мець дачыненне да зніклага яшчэ 16 верасня ў Белавежскай пушчы 10-гадовага хлопчыка. Яго пошукі, нягледзячы на каласальныя намаганні соцень людзей, плёну не далі.**

І вось на адным польскім рэгіянальным інфармацыйным сайце з'явілася паведамленне, што паліцыя горада Седльцы правярае заяву пра невядомага хлопчыка, які ехаў, схаваўшыся ў фуры, а затым, скарыстаўшыся няўважлівасцю яе кіроўцы, збег.

Апошні і зрабіў тую самую заяву ў паліцыю. Кіроўца ў электронным лісце напісаў, што заўважыў у спальным адсеку фуры хлопчыка прыкладна 10 гадоў у цёмнай вопратцы, які накрыўся коўдрай. Відавочна, ён трапіў туды падчас стаянкі машыны. Кіроўца не адразу заўважыў дзіця, а калі потым паспрабаваў задаваць яму пытанні, тое адмоўчвалася. Калі дальнабойшчык спыніўся ў наступным горадзе, каб зрабіць паведамленне пра «знаходку», хлопчык выскачыў з кабіны і збег.

Усё адбылося прыкладна за сто кіламетраў ад польска-беларускай граніцы. Паведамленне ад кіроўцы (яго асоба ўстанаўліваецца) польскія паліцэйскія атрымалі ў 20-х чыслах верасня. Сама сустрэча з хлопчыкам, калі яна сапраўды была, адбылася напярэдадні, але дакладная дата не называецца.

Ці можа быць той хлопчык і прапаўшае 16 верасня ў Белавежскай пушчы дзіця адной і той жа асобай? І польскі бок, і прадстаўнікі Следчага камітэта нашай краіны гіпатэтычна допускаюць такую версію. Польскія праваахоўнікі афіцыйна пошукі зніклага беларуса не вядуць, аднак адпаведная інфармацыя пра яго даведзена ў сумежных ваяводствах да кожнага паліцэйскага. Цяпер суседзі спрабуюць удакладніць акалічнасці сустрэчы кіроўцы і хлопчыка, шукаюць сведак, дзеля чаго і была распаўсюджана інфармацыя пра здарэнне. Аднак пакуль гэтая гісторыя працягу не атрымала.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**Неспрыяльныя дні і гадзіны ў кастрычніку**

| | | |
|---|---|---|
| **6, пятніца,** *23.00 — 24.00* | **13, пятніца,** *6.00 — 8.30* | **24, аўторак,** *19.00 — 24.00* |
| **8, нядзеля,** *16.00 — 24.00* | **15, нядзеля,** *7.30 — 13.30* | **25, серада,** *0.00 — 1.00* |
| **9, панядзелак,** *0.00 — 4.30* | **17, аўторак,** *13.30 — 19.30* | **27, пятніца,** *7.30 — 15.00* |
| **10, аўторак,** *23.30 — 24.00* | **20, пятніца,** *0.00 — 3.30* | **29, нядзеля,** *18.30 — 24.00* |
| **11, серада,** *0.00 — 5.30* | **22, нядзеля,** *13.30 — 14.00* | **31, аўторак,** *22.30 — 24.00* |

■ У цэнтры ўвагі

# ЖАНОЧАЕ ВЫХАВАННЕ

## Як спыніць фемінізацыю настаўніцкай прафесіі?



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Педагог-мужчына ў сярэдняй школе — з'ява рэдкая, у пачатковай школе, а тым больш у дзіцячым садзіку, — амаль што выключная. Між іншым, прыкладна сто гадоў таму ў большасці краін, дзе сёння гэтая прафесія ўспрымаецца як пераважна жаночая, яна разглядалася як паўнапраўная мужчынская.**

**У адным з сёлетніх нумароў перыядычнага выдання «Education Indicator in Focus», які выпускаецца пад эгідай Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР), быў прааналізаваны гендарны дысбаланс у педагагічнай прафесіі.**

### А ХТО Ў КІРАЎНІКАХ?

У сярэднім у краінах-членах і партнёрах АЭСР жанчыны складаюць прыкладна дзве трэціны ад агульнай колькасці педагогаў, занятых у сферы адукацыі (ад дашкольнага ўзроўню да вышэйшай адукацыі). Найбольшы гендарны дысбаланс назіраецца ў Эстоніі, Латвіі, Літве і Расійскай Федэрацыі. Тут з кожных пяці настаўнікаў чатыры — гэта жанчыны. З 31 краіны толькі ў Японіі настаўнікаў-мужчын больш, чым настаўнікаў-жанчын (52 і 48 працэнтаў адпаведна). Тлумачыцца гэты факт, акрамя ўсяго іншага, нізкай прадстаўленасцю жанчын на рынку працы ў Японіі ў параўнанні з іншымі краінамі.

Статыстыка сведчыць аб узмацненні фемінізацыі педагагічнай прафесіі на працягу апошніх дзесяці гадоў. Так, у краінах АЭСР сярэдняя колькасць жанчын-настаўнікаў у сферы адукацыі павялічылася з 61% у 2005 годзе да 65% у 2010 годзе. У 2014 годзе гэты паказчык дасягнуў 68%. Аднак маштаб прыросту адрозніваецца: ад 1% у Славеніі і ЗША да 15% — у Германіі, Грэцыі і Японіі.

Гендарны дысбаланс істотна вар'іруецца ў залежнасці ад узроўню займаемых пасад, ступені адукацыі і іншых акалічнасцяў. Нягледзячы на тое, што жанчыны ў настаўніцкай прафесіі пераважаюць колькасна, толькі некалькі працэнтаў з іх займаюць кіруючыя пасады. У сярэднім па краінах АЭСР сярод дырэктараў устаноў адукацыі жанчыны складаюць толькі 45%.

### ЭКАНАМІЧНАЯ НЕПРЫВАБНАСЦЬ

Гендарная няроўнасць скарачаецца ў залежнасці ад ступені адукацыі. Жанчыны складаюць 97% педагогаў на ўзроўні дашкольнай адукацыі, 82% — на ўзроўні пачатковай адукацыі і 43% — на ўзроўні вышэйшай адукацыі. Падобная карціна назіраецца ў большасці краін-членаў і партнёраў АЭСР. Выключэнне складаюць Сірыя і Турцыя (у гэтых краінах доля жанчын-настаўнікаў не перавышае 60%), а таксама Фінляндыя, Латвія, Літва і Расійская Федэрацыя, у якіх жанчыны-выкладчыкі пераважаюць у сістэме вышэйшай адукацыі.

Якімі ж фактарамі тлумачыцца цяперашні гендарны дысбаланс у прафесіі настаўніка? Адзін з іх — павелічэнне паказчыка занятасці жанчын у перыяд з 2005 па 2014 гады ў сярэднім з 56% да 59%. А, напрыклад, у Японіі, Германіі і Грэцыі фіксуецца максімальны рост колькасці жанчын на рынку працы за апошнія 10 гадоў — на 11% (у параўнанні з 8% у іншых краінах).

Значны ўплыў аказваюць і эканамічныя фактары. У той час, як доля жанчын-педагогаў памяншаецца ў залежнасці ад узроўню адукацыі (ад дашкольнай да вышэйшай), сярэдні памер заработнай платы ад дашкольнай ступені да вышэйшай школы, наадварот, павялічваецца. У краінах АЭСР сярэдняя заработная плата настаўніка ва ўзросце ад 25 да 64 гадоў паступова павялічваецца, пачынаючы з 37 000 долараў у год на дашкольным узроўні да 46 600 долараў у год у старшай школе. Найбольш ярка эканамічныя фактары выяўляюцца пры параўнанні заработнай платы ў сферы адукацыі з заработнай платай у іншых сферах (гаворка ідзе пра мужчын і жанчын з вышэйшай адукацыяй).

У сярэднім па краінах АЭСР заработная плата настаўнікаў-мужчын ва ўзросце ад 25 да 64 гадоў, якія выкладаюць у пачатковай школе, складае 71% заработнай платы мужчын з вышэйшай адукацыяй, занятых у іншых сферах (у старшай школе — 81%). У той жа час сярэдняя заработная плата жанчын-педагогаў у меншай ступені адрозніваецца ад сярэдняй заработнай платы жанчын, якія маюць вышэйшую адукацыю і занятыя у іншых галінах (яна складае каля 90% сярэдняй заработнай платы жанчын з вышэйшай адукацыяй, занятых у іншых сферах).

**Па звестках Белстата, прафесія настаўніка мае ў Беларусі ярка выражанае жаночае аблічча. Доля жанчын-настаўнікаў дасягае 86 працэнтаў у агульнай колькасці, а сярод дырэктараў і іх намеснікаў жанчын — 85 працэнтаў.**

Аўтары даследавання адзначаюць, што ў большасці краін самая вялікая колькасць жанчын — сярод маладых настаўнікаў (ва ўзросце да 30 гадоў), якія працуюць на ўсіх узроўнях адукацыі. Так, сярод педагогаў малодшых класаў сярэдняй школы ва ўзросце да 30 гадоў жанчыны складаюць 70%.

Аб павелічэнні гендарнага дысбалансу сведчыць і той факт, што доля жанчын, якія атрымалі вышэйшую педагагічную адукацыю, у сярэднім па краінах АЭСР узрасла. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што рост колькасці жанчын-выкладчыкаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі спрыяе ўстанаўленню гендарнага парытэту. Сярод маладых выкладчыкаў (да 30 гадоў) доля жанчын складае 53%, сярод педагогаў ва ўзросце старэйшым за 50 гадоў — 38%. Такім чынам, за перыяд з 2005 па 2014 гады доля жанчын сярод выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў узрасла з 38 да 43%.

### НЯНЬКА З ВУСАМІ

Гендарны дысбаланс, які склаўся ў прафесіі настаўніка, становіцца падставай для прыняцця пэўных мер на дзяржаўным узроўні. У Швейцарыі прынята праграма па падтрымцы ўніверсітэтаў у пытаннях дасягнення гендарнай роўнасці сярод выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў.

Праграма, накіраваная на павелічэнне колькасці жанчын, якія займаюць кіруючыя пасады, зацверджана Федэральным міністэрствам адукацыі і навуковых даследаванняў Германіі ў супрацоўніцтве з рэгіянальнымі ўладамі. Амаль дзве трэціны ўсіх дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў у гэтай краіне маюць план дзеянняў па рэалізацыі палітыкі ў галіне дасягнення гендарнага парытэту.

У 2013 годзе Нацыянальнае агенцтва па пытаннях адукацыі Швецыі пачало рэалізацыю нацыянальнай інфармацыйнай кампаніі, якая заахвочвае мужчын да прафесійнай педагагічнай дзейнасці ў дашкольных установах.

Аўтары даследавання падкрэсліваюць: улічваючы маштабы феномена «фемінізацыі» настаўніцкай прафесіі, было б цікава даследаваць патэнцыяльны ўплыў гэтай з'явы на якасць адукацыйных дасягненняў вучняў і іх кар'ерныя чаканні.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**5 кастрычніка настаўнікі ва ўсім свеце адзначаюць сваё прафесійнае свята**

У 1966 годзе ў гэты дзень у Парыжы прайшла Спецыяльная міжурадавая канферэнцыя, прысвечаная статусу настаўнікаў (Special Intergovernmental Conference on the Status of Teachers). У цэнтры ўвагі аказаліся праблемы работнікаў сферы адукацыі на нацыянальным і сусветным узроўнях. У выніку прадстаўнікі ЮНЕСКА і Міжнароднай арганізацыі працы падпісалі першы міжнародны дакумент, які акрэсліваў умовы працы настаўнікаў: «Рэкамендацыі наконт статусу настаўнікаў» (Recommendation concerning the Status of Teachers). У ім замацоўваліся правы і абавязкі педагогаў і міжнародныя нормы, якія датычацца падрыхтоўкі настаўнікаў, павышэння іх кваліфікацыі, прыёму на работу і ўмоў працы. Афіцыйна святкаваць Сусветны дзень настаўніка 5 кастрычніка было прапанавана ЮНЕСКА ў 1994 годзе. Цяпер гэта свята ўваходзіць у спіс сусветных і міжнародных дзён ААН.

# А ШТО КАЖА ПРАЦОЎНАЕ ПРАВА?

## Калі падчас працоўнага водпуску ў работніка захварэла дзіця, працоўны водпуск не пераносіцца і не працягваецца...

**У рэдакцыі «Звязды» прайшла прамая лінія «Усё аб працоўным праве». Чытачы газеты мелі магчымасць задаць свае пытанні юрыстам — гасцям рэдакцыі «Звязды»: галоўнаму прававому інспектару працы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васілеўне МАНЮК і галоўнаму прававому інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васілеўне ГРЫШУЦІНАЙ.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*— Добры дзень! Гэта Ярмоленка Наталля з Мінска, прадавец крамы харчовых тавараў. У мяне такое пытанне: наймальнік папярэдзіў мяне аб змяненні істотных умоў працы. У мяне змяніўся рэжым працы, і ён мяне не задавальняе, бо я езджу на работу з Маладзечна. Я адмовілася ад работы ў такіх умовах. Якія выплаты мне належыць атрымаць пры звальненні?*

**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— Для змены работніку істотных умоў неабходна яго згода на гэта, якая можа быць выказана ў выглядзе пісьмовай заявы работніка. Калі ж работнік адмаўляецца ад працягу работы па той жа прафесіі, займаемай пасады, працоўны дагавор спыняецца па п. 5 ч. 2 арт. 35 ПК.

Пры гэтым не пазней за дзень звальнення наймальнік прадастаўляе работніку ўсе належныя яму выплаты на дзень звальнення — заработную плату, кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак, а таксама выхадную дапамогу ў памеры не менш за двухтыднёвы сярэдні заробак, калі іншы, павялічаны памер выхадной дапамогі не прадугледжаны калектыўным дагаворам арганізацыі.

Акрамя таго, наймальнік абавязаны выдаць работніку ў дзень звальнення належным чынам афармленую працоўную кніжку, за атрыманне якой работнік распісваецца ў кнізе ўліку руху працоўных кніжак і ўкладышаў да іх, уласнаручна ўказаўшы дату яе атрымання. Апавяшчэння прафсаюза ў гэтым выпадку не патрабуецца.

***

*— Падчас майго чарговага працоўнага водпуску ў мяне захварэла дзіця. Хварэла доўга, гэта зафіксавана дакументальна. Я спадзявалася, што мой водпуск будзе працягнуты адпаведна часу хваробы дзіцяці. Але мне паведамілі, што гэта заканадаўствам не прадугледжана. Чаму? Калі хварэеш сам, то водпуск падаўжаецца... (ліст дасланы па электроннай пошце).*

**Ларыса МАНЮК:**

— Хачу сказаць, што ў адпаведнасці з п. 6 Палажэння аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах асобам, якія працуюць па працоўных дагаворах, на падставе членства (удзелу) у юрыдычных асобах любых арганізацыйна-прававых формаў, якія знаходзяцца ў працоўным водпуску, дапамогі прызначаюцца ў выпадку наступлення ў іх у перыяд названага водпуску часовай непрацаздольнасці. Працоўны водпуск пры гэтым падаўжаецца (пераносіцца) у парадку, устаноўленым заканадаўствам. Але — майце гэта на ўвазе — у выпадку, калі падчас працоўнага водпуску ў работніка захварэла дзіця, працоўны водпуск не пераносіцца і не працягваецца.

***

*— Добры дзень! Калі можна, я хацела б задаць сваё пытанне ананімна. Скажыце, калі ласка, ці можа кіраўнік (яго намеснік) быць прадстаўніком інтарэсаў работнікаў, гэта значыць быць старшынёй або членам прафкама школы?*

**Ларыса МАНЮК:**

— Не. У адпаведнасці з ч. 2 арт. 354 Працоўнага кодэкса кіраўнік арганізацыі і яго намеснікі не могуць ажыццяўляць прадстаўніцтва інтарэсаў работнікаў.

***

*— Добры дзень! Мяне завуць Клаўдзія Сямёнаўна, я тэлефаную вам з Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Такая вось у нас праблема: мой муж працаваў будаўніком у калгасе. Адпрацаваў 12 месяцаў і напісаў заяву на водпуск. Але ў аддзеле кадраў сказалі, што ўзяць водпуск яму не дазволяць, бо ён працаваў па дагаворы падраду, а не па працоўным дагаворы. Муж кожны месяц атрымліваў зарплату, хадзіў на работу з 8 гадзін да 17 кожны дзень, акрамя нядзелі. Скажыце, калі ласка, ці правільна яму адмовілі ў адпачынку і куды неабходна звярнуцца па дапамогу?*

**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— Не выключана, што ваш муж сапраўды падпісаў дагавор падраду, які яму прапанавалі ў арганізацыі, а не працоўны дагавор. Некаторыя наймальнікі лічаць, што не мае значэння, які з гэтых дагавораў заключаць. Але розніца ёсць, і яна вельмі істотная.

Калі з работнікам заключаны дагавор падраду, то ён не ўключаецца ў штат работнікаў арганізацыі, не падпарадкоўваецца правілам унутранага працоўнага распарадку, што датычацца працоўнага часу і часу адпачынку, не ўключаецца ў графік водпускаў, яму не налічваюцца і не выплачваюцца адпускныя, не выплачваецца штомесяц заработная плата, гэта значыць не распаўсюджваюцца гарантыі і кампенсацыі, прадугледжаныя Працоўным кодэксам.

Як відаць з вашых слоў, ваш муж фактычна працаваў па працоўным дагаворы, а не дагаворы падраду. Таму яму неабходна звярнуцца ў суд з патрабаваннем аб перакваліфікацыі грамадзянска-прававых адносін у працоўныя і заключэнні з ім працоўнага дагавора.

Пасля станоўчага рашэння суда ваш муж будзе мець права на прадастаўленне працоўнага водпуску і іншыя гарантыі і кампенсацыі, прадугледжаныя калектыўным дагаворам арганізацыі і працоўным заканадаўствам. Для аказання бясплатнай юрыдычнай дапамогі па звароце ў суд рэкамендую звярнуцца ў прававую інспекцыю працы прафсаюза работнікаў АПК.

***

*— Я ўладкавалася на часовае месца настаўнікам. Праз год сама пайшла ў дэкрэтны адпачынак да 2018 года. Адміністрацыя школы ўзяла на гэтую пасаду яшчэ аднаго работніка, гэтым разам пенсіянера. Атрымліваецца, на адной пасадзе цяпер лічацца тры чалавекі: асноўны работнік, я і пенсіянер. Асноўны работнік зараз мае намер напісаць заяву аб звальненні. Падкажыце, чаго чакаць мне? Ці прадастаўць наймальнік мне месца працы пры выхадзе з дэкрэтнага водпуску? (па электроннай пошце).*

**Ларыса МАНЮК:**

— Вы і іншы работнік былі прыняты па тэрміновым працоўным дагаворы на час адпачынку асноўнага работніка, які знаходзіцца ў сацыяльным водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў. Калі асноўны работнік, на месца якога вы абодва былі прынятыя, звольніцца, то вы і іншы работнік будзеце падлягаць звальненню ў сувязі з выхадам на работу асноўнага работніка. Кіраўнік можа таксама прыняць рашэнне пакінуць на рабоце аднаго з вас. Пры гэтым на рабоце могуць пакінуць работніка, які дасягнуў пенсійнага ўзросту, паколькі ў гэтай катэгорыі работнікаў у адпаведнасці з заканадаўствам такія ж працоўныя правы, як і ў іншых.

***

*— Добры дзень! Міронава Валянціна Пятроўна з Брэста вас турбуе. Працую настаўнікам у гарадской школе. На пачатак навучальнага года ў мяне было 30 вучэбных гадзін. Але цяпер дырэктар мне паведаміў, што з 1 студзеня паменшыць мне нагрузку да стаўкі, гэта значыць 20 гадзін. Зразумела, што пры гэтым я значна страчу ў зарплаце. У кантракце ў мяне прапісаная толькі стаўка, а не педагагічная нагрузка. Дырэктар запэўнівае, што мае права змяняць мне нагрузку кожныя паўгода. Гэта насамрэч так? Ці з'яўляецца такое памяншэнне, у адпаведнасці з заканадаўствам, істотнымі змяненнямі ўмоў працы?*

**Ларыса МАНЮК:**

— У адпаведнасці з падпунктам 24.6 п. 24 Пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі на 2016—2019 гады размеркаванне аб'ёму педагагічнай нагрузкі (уключаючы гадзіны выкладчыцкай, арганізацыйна-выхаваўчай работы і дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці вучняў) педагагічным работнікам праводзіцца кіраўніком установы адукацыі па ўзгадненні з прафсаюзам.

На пачатак навучальнага года наймальнік абавязаны выдаць загад аб размеркаванні педагагічнай нагрузкі паміж педагагічнымі работнікамі, узгадніць яго з прафсаюзам і азнаёміць пад подпіс работнікаў. Магчыма, што наймальнік парушыў заканадаўства і не азнаёміў вас з загадам, таму вы і не ведалі, якая ў вас будзе педагагічная нагрузка ў другім навучальным паўгоддзі. А ў адпаведнасці з навучальным планам на 2017/2018 навучальны год у другім паўгоддзі ваша педагагічная нагрузка, цалкам магчыма, складае 20 гадзін.

У выпадку ж калі наймальнік мае намер забраць у вас частку педагагічнай нагрузкі ў другім паўгоддзі і аддаць іншаму работніку, ён павінен абгрунтаваць гэтае рашэнне і ўзгадніць з прафсаюзам. А вас у адпаведнасці з арт. 32 Працоўнага кодэкса (ПК) папярэдзіць за месяц у пісьмовым выглядзе аб змяненні істотных умоў працы.

***

*— Добры дзень. Дапамажыце разабрацца ў сітуацыі. Пасля дэкрэтнага водпуску я выйшла на работу. Майму дзіцяці 2,6 года. Мне далі нагрузку ў школе 26 гадзін. А цяпер яшчэ і навязваюць класнае кіраўніцтва. Ці маю я права ад яго адмовіцца? Бо ў адваротным выпадку мне неабходна будзе працаваць і ў суботу, а мне няма з кім пакінуць дзіця на гэты час (па электроннай пошце).*

**Ларыса МАНЮК:**

— У службовай інструкцыі настаўніка агульнаадукацыйнай установы ўказана, што ён ажыццяўляе навучанне і выхаванне навучэнцаў. Праводзіць выхаваўчую і пазакласную работу па прадмеце.

Пад педагагічнай нагрузкай пры вылічэнні стаўкі педагагічных работнікаў разумеецца аб'ём педагагічнай дзейнасці ў частцы рэалізацыі зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання, уключаючы дадатковы кантроль вучэбнай дзейнасці вучняў і арганізацыйна-выхаваўчай работы.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што стаўка настаўніка ўключае ў сябе і гадзіны арганізацыйна-выхаваўчай работы. Таму, калі гэта неабходна, настаўнік павінен ажыццяўляць і класнае кіраўніцтва.

У вашым выпадку неабходна звярнуцца ў прафсаюз, і вас у парадку выключэння па хадайніцтве прафсаюза могуць на гэты навучальны год вызваліць ад гадзін класнага кіраўніцтва.

***

*— Вам тэлефануе Булат Васіль Мікалаевіч, рабочы сельскагаспадарчага філіяла вёскі Руднае Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Я быў прыняты на работу ў сельскагаспадарчы філіял тэрмінам на 6 месяцаў на час выканання сезонных сельскагаспадарчых работ, і са мной заключылі тэрміновы працоўны дагавор. Па заканчэнні дагавора я папрасіў яго падоўжыць, але наймальнік мне адмовіў. Ці правамерна гэта? На якіх умовах я магу яшчэ працаваць у гэтай гаспадарцы?*

**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— У гэтай сітуацыі наймальнік мае рацыю. Паводле ч. 1 арт. 299 Працоўнага кодэкса сезоннымі з'яўляюцца работнікі, занятыя на работах, якія выконваюцца не круглы год, а на працягу пэўнага перыяду, сезона, які не перавышае шасці месяцаў. Акрамя таго, пералік сезонных работ зацверджаны пастановай Мінпрацы і з'яўляецца вычарпальным.

Калі вы і наймальнік жадаеце працягнуць працоўныя адносіны, то наймальніку неабходна звольніць вас у сувязі са скančэннем тэрміновага працоўнага дагавора, заключанага на час выканання сезоннай працы, і зрабіць наступным чынам: альбо заключыць новы тэрміновы працоўны дагавор на 6 месяцаў, ізноў на час выканання сезоннай працы, альбо заключыць працоўны дагавор на нявызначаны тэрмін ці кантракт, але ўжо на іншую, не сезонную працу.

***

*— Ці павінен дырэктар ці яго намеснікі перадаць навучальныя гадзіны настаўніку, калі ва ўстанове адукацыі ў педагагічных работнікаў памяншаецца педагагічная нагрузка або яны падлягаюць звальненню па п. 1 арт. 42 Працоўнага кодэкса — скарачэнне колькасці або штату работнікаў у сувязі з адсутнасцю гадзін па прадмеце? (па электроннай пошце).*

**Ларыса МАНЮК:**

— Кіраўнікі (іх намеснікі) устаноў адукацыі (іх структурных падраздзяленняў) могуць выконваць у працоўны час аплачваемую педагагічную дзейнасць у частцы рэалізацыі адукацыйных праграм на месцы асноўнай працы ў аб'ёме не больш за палову нормы гадзін педагагічнай нагрузкі за стаўку педагагічных работнікаў альбо працоўнага часу прафесарска-выкладчыцкага складу.

Калі ва ўстанове адукацыі ў педагагічных работнікаў памяншаецца педагагічная нагрузка або яны падлягаюць звальненню па п. 1 арт. 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — скарачэнне колькасці або штату работнікаў у сувязі з адсутнасцю гадзін па прадметах, — гадзіны, якія вядуць дырэктар і яго намеснікі па гэтых прадметах, павінны быць перададзены настаўнікам-прадметнікам, паколькі дырэктар і яго намеснікі прынятыя на работу па вышэйпаказаных пасадах, што з'яўляецца іх асноўнай работай, а ў настаўнікаў асноўнай работай з'яўляецца педагагічная дзейнасць.

***

*— Добры дзень! Ганна Радзько вас турбуе. У мяне пытанне: наколькі дакладна калектыўны дагавор установы павінен капіраваць макет калектыўнага дагавора, падрыхтаваны Цэнтральным камітэтам Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, у асноўнай яго частцы, ці гэта можа быць цалкам адвольны варыянт?*

**Ларыса МАНЮК:**

— У адпаведнасці з арт. 364 Працоўнага кодэкса змест калектыўных дагавораў вызначаецца бакамі ў адпаведнасці з генеральным, тарыфным і мясцовымі пагадненнямі (пры іх наяўнасці) у межах іх кампетэнцыі, а таксама Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Макет калектыўнага дагавора распрацаваны Цэнтральным камітэтам Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам, Указам Прэзідэнта Беларусі ад 15.07.1995 года №278 «Аб развіцці сацыяльнага партнёрства», Законам Рэспублікі Беларусь «Аб прафесійных саюзах», галіновымі пагадненнямі, заключанымі паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі на 2016—2019 гады, іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, на аснове Метадычных рэкамендацый Мінпрацы аб парадку падрыхтоўкі і заключэння калектыўных дагавораў у арганізацыях бюджэтнай сферы.

Згаданы макет калдагавора носіць рэкамендацыйны характар, служыць арыенцірам, мэта якога — не выпусціць ні адно важнае пытанне жыццядзейнасці калектыву работнікаў пры заключэнні калектыўнага дагавора.

Макет мэтазгодна выкарыстоўваць у якасці асновы, ён можа ўдакладняцца, дапаўняцца і выкарыстоўвацца, зыходзячы з вытворчых умоў і фінансавых магчымасцяў канкрэтнай арганізацыі.

**Святлана БУСЬКО.** busko@zviazda.by

Сямейная газета
Выпуск №19 (86)



## ДЗЯКУЙ, ШТО ЎЗЯЎ ГРАШЫМА

На выхадных у суседзяў маіх бацькоў здарылася бяда. Дзядзька Казік разам са сваёй дарослай пляменніцай паехалі на машыне ў журавіны на балота Ельня. Выехалі з дому зранку ў суботу. Ужо пачало цямнець, а іх няма. І тэлефон часова недаступны... Якія толькі думкі не лезлі ў галаву: не дай бог, праваліліся ў балотнае «вакно». Іх у Ельні, кажуць, хапае... Тым больш, на тое балота ў ягады шмат гадоў таму пайшоў адзін мясцовы мужчына ды не вярнуўся...

Але неўзабаве дзядзька Казік усё ж такі выйшаў на сувязь з жонкай. Сказаў, што заблукалі. На шчасце, у іх з сабой аказаліся запалкі. Распалілі вогнішча і ўсю ноч сядзелі грэліся, сушылі адзенне. Як толькі пачало світаць, прыняліся шукаць выйсце з балота.

У нядзелю па дарозе ў Мінск думка пра тое, як яны там, не выходзіла ў мяне з галавы. Гадзін у шэсць вечара, калі стэлефанавалася з мамай, дзядзька Казік быў ужо дома, жывы і здаровы. Кажа, што прайшлі шмат кіламетраў, пакуль выбіліся ў вёску. Праўда, не ў тую, з якой заходзілі на балота, а ў іншую. Там мясцовая бабулька накарміла ягаднікаў варанай бульбай, абагрэла, пакуль іх не забралі на машыне сваякі. На шчасце, усё абышлося.

Чаго не скажаш пра 10-гадовага Максіма, якога ўжо больш як два тыдні шукаюць у Белавежскай пушчы. На дапамогу ратавальнікам выйшлі тысячы валанцёраў. Уся краіна сочыць за пошукамі хлопчыка. Людзі моляцца, спадзяюцца на цуд. І я не выключэнне. Увесь час думаю пра Максіма. Штораз, калі заходжу ў інтэрнэт, хочацца прачытаць два словы: «Знайшлі! Жывы!»

Апошнім часам вельмі шмат думаю пра тонкую мяжу паміж жыццём і смерцю. Асабліва пасля таго, як сама стала кіраваць машынай. Раней пра страшныя здарэнні на дарозе з сумным зыходам, як правіла, чытала ў інтэрнэце. Цяпер часта даводзіцца бачыць іх на свае вочы. А нядаўна на ўласнай скуры адчула, чым пагражае вялікая хуткасць.

У той дзень — гэта быў панядзелак — зранку мы вярталіся з Віцебска ў Мінск. Мне трэба было паспець на работу, таму, каб ехаць на максімальнай хуткасці (на трасе М1 можна разганяцца да 129 км/г), за руль сеў муж. Я практычна ўсю дарогу спала. Прачнулася ад таго, што Вова кінуў мне на калені тэлефон (тэлефанавала мая маці) і тым самым на імгненне адцягнуў сваю ўвагу ад дарогі. У гэты момант машыну тузанула і яна на долю секунды апынулася на ўзбочыне (на наша шчасце, асфальтаванай і адносна шырокай, а адбойнік быў за некалькі метраў наперадзе). Муж паспеў своечасова зрэагаваць і выруліць на шашу. Зноў жа пашанцавала, што побач не было іншых машын.

...Страх (і ўсведамленне таго, што магло адбыцца) прыйшоў дзесьці праз хвіліну. У той момант мы вырашылі, што больш на такой вялікай хуткасці ездзіць не будзем, як бы ні спазняліся.

Памятаю, калі ўвечары вярталася з работы дадому, ліў дождж і дзьмуў пранізлівы вецер. Але я наўмысна не надзявала пальчаткі і не раскрывала парасон. Атрымлівала асалоду ад таго, што мае рукі мерзнуць. Што я магу адчуваць мокрыя кроплі на сваім твары.

Гэтай зімой мой знаёмы перавярнуўся на машыне разам з сынам. Іншамарка разбілася ўшчэнт. Але ні Мікіта, ні малы не пацярпелі. «Першая мая думка была: дзякуй, Божа, што ўзяў грашыма!» — расказваў ужо потым Мікіта. — У той дзень я нічога не мог змяніць. Але мог змяніць за паўгода да аварыі. ЖЫЦЬ ПА-ІНШАМУ, так, каб ехаць у той момант у іншым месцы. Бо ўсе сітуацыі ў сваім жыцці ствараем мы самі. І я разумею, што калі зараз не выкарыстаю свой шанц, не памяняю стаўленне да прыроды ды іншых людзей, то наступны раз мяне ніхто ўжо не выратуе...»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Добрая справа

# ПАЎСОТНІ ХВАСТОЎ,

## АБО ЯК ВЫРАТАВАЦЬ ДЛЯ СЯБЕ СЯБРА



Фота Надзеі БУЖАН.

**У прытулку кожны сабака мае сваю будку і вальер, дзе можа пабегаць з сябрамі.**

**Калі маеце сабаку, тады ведаеце, што кожны раз, калі вяртаецеся дадому, вас з нецярпеннем чакае верны сябар. У Яніны КАЗЛОВАЙ такіх больш за 50! У Лельчыцах яна арганізавала сямейны прытулак «Томас» і разам са сваякамі ратуе сабак і катоў раёна.**

### Дай лапу, Герда!

— Я дзесяць гадоў жыла ў Мінску: вучылася, а потым працавала. Калі пераехала ў Лельчыцы, на базу, дзе знаходзіцца фірма таты, перыядычна прыбіваліся бяздомныя сабакі. Я варыла ім кашу і прывозіла. Так цягнулася каля года. Потым мне ўжо мэтанакіравана падкінулі сюды шчаня. Калі яно вырасла, нарадзіла тут сваіх дзетак. Яны і сталі першымі жыхарамі нашага прытулку, — расказвае Яніна.

Ідэю Яніны падтрымалі тата і брат Уладлен. Яны пабудавалі вальеры па перыметры базы, дзе і пасяліліся яе падапечныя. Яшчэ двое сабак зараз жывуць на тэрыторыі іншага прадпрыемства.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

■ Сустрэча без абцасаў

# «Мама — сонца, тата — месяц. Абое цудоўныя, але не могуць быць разам...»

**Дырэктар уласнага дома моды Наташа Поткіна расказала, чаму нельга настройваць дзяцей супраць свайго былога мужа**

**Калі мы завіталі ў кватэру дызайнера адзення, на кухні гудзела сушылка для гародніны і садавіны. А гаспадыня пералівала ў слоікі персікавае варэнне. «Адправіла дзяцей у школу, мужа — на работу, а сама, як бачыце, рэалізоўваю свае кулінарныя фантазіі».**

### Пра персікавыя чыпсы, вяленыя памідоры ды суКенку з перцаў

**Усё, звязанае з працай — шпількі, іголкі, кавалкі тканіны, — знаходзіцца ў маёй майстэрні.** Дома няма нават швейнай машынкі. Тут у мяне іншыя захапленні. Вось частуйцеся: чыпсы з ківі і персікаў. Апошнія некалькі гадоў я захапілася здаровым харчаваннем. Стараюся прыдумваць стравы не толькі смачныя, але і карысныя.

**На выхадных не ўтрымалася — накупіла поўны багажнік гародніны.** І ажно чатыры скрыні персікаў. Вось наварыла з іх варэння. А таксама пазычыла ў мамы сушылку ды насушыла персікавых чыпсаў. Дзеці іх вельмі любяць. Таксама паспела зрабіць вяленыя памідоры. Магу падзяліцца рэцэптам. Спачатку трэба высушыць таматы чэры, а затым дадаць спецыі і заліць алівкавым алеем. *(Дастала з халадзільніка слоічак.)* Вось якая прыгажосць атрымалася! Прыходзьце тыдні праз два — пачастую, яны павінны яшчэ настояцца.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***



**Перцы чылі, якія засталіся ад дызайнерскай сукенкі Наташы ПОТКІНАЙ.**

■ Беражыце сябе

# ДАПАМОГА ПРЫЙДЗЕ...

## Але правілаў бяспекі ніхто не адмяняў

**Лічбы, звязаныя з пошукам людзей, сёлета ўражваюць. Адыходзіць грыбны час, але наперадзе яшчэ збор журавін — гэта балоты і блуканне людзей у такіх мясцінах — таксама вельмі вострая тэма. Між іншым, многіх праблем можна пазбегнуць, калі прытрымлівацца простых правілаў бяспекі.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Калі вы згубіліся...

Самае важнае правіла: не панікаваць. Гэта цяжка, але пастарайцеся: паніка, разгубленасць, неразуменне, куды бегчы, адымае самыя каштоўныя сілы, якія патрэбны чалавеку для таго, каб пратрымацца, пакуль яго знойдуць. Пасядзіце, падумайце пра іншае, абдыміце дрэва.

Калі спрабуеце выбрацца, выходзьце толькі ў светлы час сутак. Не ідзіце ўначы і ў прыцемках. Калі выйшлі да прасекі, трымайцеся яе, не вяртайцеся зноў у лес, таму што падобныя мясціны ратавальнікамі даследуюцца ў першую чаргу, так званыя лінейныя прачосы робяцца і па дарогах і рэках. Убачылі раку — ідзіце ўніз па цячэнні. Трымайцеся таксама лініі электраперадачы — яна абавязкова выведзе ці на дарогу, ці да населенага пункта. Вы ў лесе, нічога не знайшлі, а ўжо вечарэе? Пакуль светла, арганізуйце месца для начлегу з падручных сродкаў (напрыклад, галінак, калі ёсць дажджавік, накіньце зверху, гэта дапаможа захаваць цяпло).

Па магчымасці, развядзіце вогнішча, выкарыстоўвайце хвойныя галінкі, каб ствараць добры дымавы сігнал, ён бачны здалёк, вас лягчэй будзе знайсці.

Калі збіраецеся ў лес, заўсёды апранайце яркую вопратку. Цяпер папулярнае адзенне так званага колеру хакі, але падобная афарбоўка прыдумлялася вайскоўцамі для таго, каб хавацца. Пры сабе абавязкова трэба мець хоць бы якую ежу і ваду. Абавязкова паведамляйце сваякам аб месцы, дзе вы ўвайшлі ў лес, каб, калі вы заблукаеце, людзі ведалі, адкуль пачынаць пошукі. Важна мець пры сабе тэлефон і берагчы зарадкі. Калі згубіліся, паведамляйце аб гэтым на нумары 101, 112.

### Збіраецеся стаць валанцёрам?

Па-першае, вызначцеся, ці гатовы вы фізічна і псіхалагічна гэта рабіць, інакш пасля самі можаце стаць чалавекам, якому патрэбна дапамога. Па-другое, падрыхтуйце неабходныя рэчы: яркую вопратку, некалькі пар шкарпэтак ды нацельнай бялізны, адпаведны абутак.

Зразумела, з сабой трэба мець ліхтарык, ахоўныя акуляры, пальчаткі.

Калі вы прыбылі на месца, павінны цалкам падпарадкоўвацца камандам прафесіяналаў (немагчыма навічкам «у двух словах» расказаць, як вядзецца пошук, гэтаму вучаць на спецыялізаваных трэнінгах). Не праводзьце пошукі самастойна, не бярыцеся за справу ў цёмны час сутак, каб не давялося ратаваць яшчэ і вас. Абавязкова неабходна паведамляць аб сваім прыбыцці, і адзначацца, калі вы выходзіце. Важна сачыць за часам, каб самім не застацца ў лесе. Так, многія хочуць дапамагчы, але ў стрэсавай сітуацыі нярэдка страчваюць сувязь з рэальнасцю.

Гэтыя рэкамендацыі прадаставіла Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа — адна з арганізацый, якая выязджае на пошукі людзей.

### Як шукалі Максіма

***— Згубіўся блізкі чалавек. У якіх сітуацыях можна звяртацца ў Чырвоны Крыж, а калі — у іншыя інстанцыі?***

— Найперш трэба звяртацца ў аддзелы Міністэрства ўнутраных спраў па месцы пражывання. Пры неабходнасці МУС прыцягвае да пошукаў нас. Калі прыбываем на месца, паступаем пад кіраўніцтва каардынуючага органа і выконваем пастаўленыя задачы, у тым ліку і прачосы пэўных квадратаў, — расказвае **начальнік аддзела па надзвычайных сітуацыях і пошуку Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый РУСАКОЎ**. — Для нас найбольш цяжкімі сталі пошукі 10-гадовага Максіма Мархалюка, туды былі накіраваны два падраздзяленні — атрады хуткага рэагавання «Гродна» і «Іслач», разгорнуты палаткі Чырвонага Крыжа, праводзілася першапачатковая рэгістрацыя тых, хто прыбываў. У гэтай маштабнай аперацыі разам з прадстаўнікамі МУС і МНС удзельнічалі прадстаўнікі розных арганізацый і прадпрыемстваў. Ды і жыхары Новага Двара аказаліся настолькі адкрытымі і гатовымі падтрымаць ратавальнікаў, што людзі гатавалі ў сябе ежу на пліце і прыносілі да нашых палатак. У нас збіралася вялікая колькасць кансерваў, закатак. Давялося аказваць і першую дапамогу, прычым такія выпадкі былі неадзінкавыя. Так, мы два разы выклікалі хуткую дапамогу на поле, таму што пошукавікам станавілася дрэнна. Вялікую работу правялі па псіхасацыяльнай падтрымцы. Блізкія, сябры, аднавяскоўцы таксама знаходзіліся ў крызісным стане, над імі лётаюць верталёты, ездзяць валанцёры на джыпах, працуюць ратавальнікі. І, зразумела, людзям трэба было дапамагчы спраўляцца са стрэсам. Нашы спецыялісты працавалі на базе Навадворскай школы, адпаведныя заняткі правялі з дзецьмі ад першага да адзінаццатага класа. Мы сустрэліся з педагагічным калектывам, таму што маці Максіма працуе ў гэтай школе. Адпрацавалі з бацькамі класа, у якім вучыцца хлопчык, з бацькамі сяброў Максіма.

***— Чаму такая важная дапамога грамадскасці?***

— Абучаныя каардынатары пошуку могуць узяць сабе ў каманду некалькі непадрыхтаваных людзей і праводзіць мерапрыемствы па зададзеных квадратах. Можна паглядзець, што тэрыторыя пошуку тут вялікая і неаднастайная: ёсць палі, прылескі і пушча — лес у некранутым выглядзе. Тут і прайсці цяжка, а трэба яшчэ і шукаць. Таму і было прыцягнута столькі сіл і сродкаў. Пры дапамозе добраахвотнікаў закрылі больш дэталёва вялікія квадраты. Гэта датычыцца не толькі прачосаў, але і выстаўлення пікетаў, калі б, напрыклад, дзіця выйшла сюды, яны б яго ўбачылі. З боку валанцёраў, якія прыбывалі, часам ідуць нараканні, што іх выкарыстоўваюць неэфектыўна. Гэта не так, проста былі розныя задачы. За гэты час многія людзі вырашылі да нас далучыцца, прайсці навучанне і апрануць форму з чырвонымі крыжамі.

***— Чым могуць нашкодзіць «стыхійныя» валанцёры?***

— Па-першае, яны могуць згубіцца. Па-другое, парушыць следавы малюнак, убраць нейкія рэчы, якія для прафесіяналаў маюць вялікае значэнне. Напрыклад, паламаная галінка для валанцёра, які толькі ўвайшоў у лес, нічога не значыць, а для лесніка ці іншага спецыяліста — гэта вельмі многа.

***— На пошукі Максіма выязджалі тысячы добраахвотнікаў з усёй Беларусі. Ці заўсёды вялікая колькасць людзей — гэта добра?***

— Чырвоны Крыж зараз быў не гатовы да адначасовага прыняцця такой вялікай колькасці людзей і каардынацыі іх работы. Думаю, іншыя пошукавыя атрады таксама. Але для нас гэта ўжо атрыманы ўрок, мы будзем развіваць структуру кіравання спантаннымі валанцёрамі.

***— Ці шкодзяць пошукам парады экстрасэнсаў, празорлівцаў, магаў?***

— Яны, канешне, звяртаюцца, але з нашай практыкі не магу прывесці ніводнага прыкладу, калі гэта дапамагло. Ратавальнікам і так цяжка, яны рэагуюць на папрокі «чаму не шукаеце». А як сябе паводзіць валанцёру, якому заяўляюць, што нібыта чалавек ведае, што трэба шукаць нейкі шэры дом з падвалам? Гэта дэстабілізуе, парушае структуру работы па ўжо зададзеных кропках. Часам бывае, людзі кажуць, што бачылі прапаўшага. Гады тры-чатыры назад мы да гэтага рэзка адносіліся, цяпер прызвычаіліся, проста спакойна адпрацоўваем элемент. Многім людзям хочацца паўдзельнічаць у пошуках, быць карыснымі, часам ім можа і падацца, што яны бачылі некага падобнага. Калі столькі ўсюды паказвалі згубленага хлопчыка, міжволі ўзнікае адчуванне, што ты яго бачыў.

У нас з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях ёсць сумесная распрацоўка — выкарыстоўвалі таксама і на гэтых пошуках — праграма «МНС Беларусі: дапамога побач». У ёй днямі з'явілася спецыяльная ўкладка: паведаміць аб тым, хто згубіўся. Любы, хто скачаў праграму на платформе Android, можа ўвайсці ў яе, і адразу будзе бачна, дзе ён знаходзіцца. Тут можна напісаць кароткі зварот, які ўбачаць ратавальнікі. Гэта распрацоўка цяпер актыўна тэсціруецца, будзем яе паляпшаць. Як бачыце, з дапамогай няхітрай рэчы людзі, якія згубіліся ў лесе, змогуць сабе дапамагчы.

## Дамашні ўрок «АБЖ»

**Каб дзіця не згубілася, мала заняткаў у садках і школах, ды і ад прафілактычнай гутаркі не будзе ніякай карысці. Над гэтым трэба працаваць карпатліва, ці не кожны дзень, прычым пачынаць з самага пяшчотнага ўзросту.**

### Малы ў горадзе

Зусім маленькія дзеткі заўсёды «хвосцікам» ходзяць за бацькамі, але гарантый, што вы іх не згубіце, напрыклад, у транспарце ці гандлёвым цэнтры, няма. Таму самае першае, чаму мы павінны навучыць малога — адказваць на пытанні, як завуць яго самога, маму, тату, якое прозвішча і адрас, а яшчэ лепш тэлефонны нумар бацькоў. Можна пакласці ў кішэню дзіцяці запіску з гэтай інфармацыяй, а можна зрабіць спецыяльную нашыўку на вопратку.

Калі выбіраецеся ў горад, прагаворвайце з малым назву вашай станцыі і той, на якую кіруецеся. Лічыце, колькі прыпынкаў праехалі, які нумар маршрута. Паспрабуйце прыкінуцца, што задрамалі, каб дзіця вас пабудзіла на патрэбным прыпынку. Паверце, праз некалькі гадоў у вас не будзе балець галава аб тым, што сын ці дачка недзе могуць згубіцца, бо яны будуць здольныя даехаць дадому самастойна. Цудоўна, калі дзіця пры гэтым яшчэ ўмее арыентавацца па карце і знаходзіць маршрут пры дапамозе гаджэтаў.

### Асцярожна: незнаёмцы

Назірайце за людзьмі на вуліцы. Пакуль дзіця маленькае і цалкам вам давярае, можна вучыць правілам бяспекі. Звярніце ўвагу на таго, хто кінуў брудную паперку пад нogі, а не ў сметнік, на людзей у нецвярозым стане, на тых, хто нешта ламае. Гэта добрая падстава пагаварыць аб тым, што бываюць кепскія ўчынкі, што ёсць людзі добрыя і дрэнныя, і што нельга давяраць усім дарослым. Адсюль пераходзім да знаёмства з простымі правіламі: «Калі ты адзін, не размаўляй з незнаёмымі людзьмі, не прымай падарункаў і не ідзі за чужакамі». Пагуляйце ў разведчыкаў, завядзіце пароль. Дамоўцеся, што калі незнаёмцы будуць угаворваць дзіця пайсці з імі, маўляў іх прыслала маці, не паддавацца, калі яны не ведаюць сакрэтных слоў. А ў выпадку небяспекі — крычаць!

### Ёсць кантакт

Станьце свайму дзіцяці найлепшым сябрам. Завядзіце добрую звычку яшчэ з дзіцячага садка дзяліцца навінамі. Расказвайце, што з вамі адбылося за дзень і цікаўцеся, як яго правёў малы. Паспрабуйце наладзіць адкрытыя і даверлівыя адносіны з дзіцем, пакуль яно маленькае і праблемы яго «неглыбокія». Калі гэта ўпусціць цяпер, пазней магчыма наладзіць кантакт і не атрымаецца. А такое сяброўства дарагога каштуе. Вы будзеце ў курсе ўсіх перамяшчэнняў дзіцяці, і калі раптам яно недзе затрымалася, ведаць, з чаго пачынаць пошукі.

Ваша кватэра стала «гасцявым» пакоем для сяброў сына ці дачкі? Лішні шум можна пацярпець, затое вы зможаце атрымаць масу дастатковай інфармацыі пра жыццё свайго дзіцяці, яго інтарэсы.

Запішыце сыноў і дачок у гурткі і спартыўныя секцыі — у плане бяспекі тут шмат плюсаў: ваша дзіця занята і пад наглядам, плюс вакол яго ствараецца кола з добрых сяброў, якіх аб'ядноўвае хобі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЦУДАМ ЗАСТАЎСЯ Ў ЖЫВЫХ

**Больш як стагоддзе мінула з той пары, як загрымелі залпы Першай сусветнай. Памяць пра яе захоўваецца ў фотаздымках таго часу ў маім сямейным альбоме. Так склалася, што яна акрэсліла лёс і сям'і майго дзеда Вікенція Дамінікавіча Тычко з вёскі Мілашова Мёрскага раёна. Дзядуля быў амаль беззямельным селянінам, ды багаты на сям'ю. Меў пяць сыноў і тры дачкі.**

З прычыны малазямелля ўсе старэйшыя сыны шукалі заробкаў у горадзе. Іван і Юзаф працавалі ў Рызе на будоўлі. Фелікс — на спіртзаводзе. Старэйшы напарнік, з якім здымалі куток, і зімой і летам насіў ватовую шапку, у якой меўся «сакрэт». У канцы змены апускаў яе ў ёмістасць са спіртам і надзяваў на галаву. Дома выціскаў і атрымліваў «санальку», палову чакушкі чыстага спірту. Праўда, гэтыя ўрокі не збілі з толку майго дзядзьку, ён бярог кожную капейку, каб «набыць зямлі, прыдбаць свой кут». Але планы, як і грошы, не збыліся.

Тэрміновую службу Фелікс праходзіў на самай паўднёвай кропцы Расійскай імперыі ў крэпасці Кушка. Падчас вайны іх полк перакінулі на Заходні фронт. У час артабстрэлу пад ім быў забіты конь, а Фелікс моцна ўдарыўся і атрымаў кантузію. Урач у лазарэце папярэдзіў, што ён стане гарбатым.

І сапраўды, у старасці дзядзька рухаўся ледзь не на чацвярэньках. Сям'і не завёў. Вельмі любіў нас, сваіх пляменнікаў. Узяў на выхаванне адну з пяці маіх сясцёр, якая даглядала яго да смерці.

Усе мае дзядзькі ваявалі. А ў 1916 годзе на фронт быў мабілізаваны Франак — мой бацька. Адправіўшы пятага, апошняга сына ў пекла вайны, дзед Вікенцій не вытрымаў, занямог і ў хуткім часе памёр.

Франц спачатку служыў у Эстоніі, адкуль прыслаў фотаздымак *(ён сядзіць)*, пазней у раёне Дзвінска.

Сярод салдат склалася небяспечная мода — пасля артабстрэлу збіраць паблізу траншэяў кольцы ўшчыльнення з алюмінію, з яго выплаўлялі лыжкі. Франц, вядома, не стаяў у баку ад такога «палявання».

Аднойчы, калі бацька пайшоў па здабычу на нейтральную паласу, на пазіцыю наведалася высокае начальства. Салдата, што з'явіўся з варожага боку, абвінавацілі ў «братанні» і загадалі расстраляць. Толькі дзякуючы ротнаму (Франц быў у ліку лепшых радавых) загад быў адменены.

Мінулае стагоддзе было трагічным не толькі для народаў, дзяржаў, але і для сем'яў канкрэтных людзей, у тым ліку і маёй радні.





**Дзядзькі, калі працавалі ў Рызе, запрасілі сваю маці, маю бабулю Ганну, прыехаць да іх у госці і сфатаграфаваліся ў фотасалоне. Для салідНасці ёй далі ў рукі кнігу. Сядзіць Іван, злева з вусамі Фелікс і Юзаф. Бабуля Ганна была рашучага характару, відаць, у сваю маці Малгажату, якая пешкі дайшла ў Падмаскоўе, дзе служыў яе муж Дамінік, і несла ражачку (невялікае драўлянае вядзерца) квашанай капусты.**

Па Брэсцкім мірным дагаворы тэрыторыя нашага раёна апынулася пад Польшчай, і бацька мой, прайшоўшы выпрабаванні вайной, «прызямліўся» ў роднай вёсцы.

Стаў працаваць у ксяндза на гаспадарцы і закрыстыянам-служкам пры богаслужэннях.

З прыходам «вызвалення» з Усходу ў 1939-м пачаліся праследаванні святароў. Напярэдадні вайны быў арыштаваны ксёндз Эліяш, не забыліся прыхапіць і майго бацьку і змясціць палітычных у Беразвечча.

З падыходам немцаў пад Глыбокае выконваўся загад НКУС усіх вязняў пераправіць у тыл. Эвакуацыя рабілася ў страшэннай спешцы. Бацька стаяў у камеры з боку дзвярэй, і калі вартавыя пачалі прыкладамі выганяць арыштаваных, аказаўся незаўважаным. Дачакаўшыся цішыні, ноччу пакінуў вязніцу.

Калона вязняў пад канвоем накіроўвалася ў бок Полацка, каля мястэчка Ветрына наляцелі два нямецкія самалёты, і канвой выканаў загад: пры небяспецы ўсіх расстраляць. Успамінаючы гэтыя падзеі, бацька маліўся, дзякаваў Богу за цудоўнае выратаванне.

Франц памятны мясцоваму насельніцтву як ініцыятар і руплівец аднаўлення нашага касцёла Маткі Боскай Шкаплернай.

У 1949 годзе храм быў пераробраны ў раённы склад. З пачаткам палітычнай «адлігі» больш актыўныя вернікі пачалі збіраць подпісы аб вяртанні святыні.

Бацьку давялося абіваць парогі не толькі абласных упраўленняў, а і рэспубліканскіх, як ён гаварыў, быў на прыёме ў «чырвонага біскупа», напэўна, у старшыні камісіі па справах рэлігіі. Дзякуючы намаганням актывістаў у 1956 годзе касцёл пачаў сваю дзейнасць.

На жаль, з нашай вялікай сям'і застаўся я адзін, а бацька сышоў на 71-м годзе. Вечная памяць яму і ўсім маім памерлым родным.

**Альфрэд ТЫЧКО,**
*в. Ідолта, Мёрскі раён*

■

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

Сямейная пошта

# КУЛЬТ КНІГІ

**Культ кнігі прайшоў праз усё маё жыццё ад самага маленства. Ён жыў у нашай сям'і, хоць бабуля была зусім непісьменная, пры патрэбе распісвалася крыжыкамі, а мама скончыла адзін клас польскай школы, але ўмела чытаць па-руску і па-славянску, бо яе бацька, мой дзед Мікіта, навучыў яе гэтаму.**

У нас дома па зімовых вечарах былі калектыўныя чытанні. Чытала мама, я (навучылася чытаць у пяць гадоў), а бабуля была пастаяннай слухачкай. Яна таксама ведала шмат казак. Ляжым іншы раз на печы, а бабуля апавядае пра Баву Каралевіча, пра сястрыцу Аленку і яе братка Іванку. Мне не надакучвала слухаць гэтыя казкі многа разоў запар. Кніг у сям'і амаль не было. Час майго дзяцінства быў неспрыяльны (я з 1935 года), якраз вайна. Памятаю толькі дзедава свяшчэннае пісанне і чытанку для малодшых класаў, мамін буквар на польскай мове ды «Палескія рабінзоны». Апошнюю кнігу ахрысцілі «Мірон», бо значэння слова «рабінзоны» ніхто не ведаў. Вось і чыталі мы іх па вечарах. Лічу, што такія сямейныя чытанні вельмі карысныя, бо яны збліжаюць.

А цяпер у мяне ёсць цэлы стос кніг, падпісаных уласнаручна самімі аўтарамі, і не проста аўтарамі, а дарагімі мне людзьмі. Кніга пакідае ў тваёй душы след, пісьменнік становіцца тваім суразмоўнікам, блізкім чалавекам. Ты выношваеш змест кнігі ў сабе яшчэ некаторы час пасля прачытання. А потым звяртаешся да асобных яе месцаў і перачытваеш, а пры перачытванні атрымліваеш не меншую асалоду, чым пасля першага чытання.

Некалькі разоў я не ўстрымалася і напісала падзяку аўтару. Страшнавата пісаць, бо лічыш пісьменніка нейкім недасягальным, а ён аказваецца простым, звычайным, нават блізкім табе чалавекам. Данута Янаўна Бічэль, можна сказаць, стала маёй сяброўкай. Праездам мы з дачкой і зяцем нават пабывалі ў яе дома. Які ж гэта чалавек! Чалавек усёабдымнай любові. Як яна бачыць наскрозь, разумее кожнага і можа падтрымаць і дапамагчы ў любы час.

Прачытала кнігу Уладзіміра Ліпскага «Жыві сёння», дзе яго вершы на кожны жыццёвы выпадак, на кожную дату, на ўсякі настрой, і напісала яму пра гэта. А ён прыслаў мне сваю кнігу "Усе мы радня" і параіў радавацца кожнаму дню зямнога раю.

Маю я кнігу «Пасланец Праметэя» пра Уладзіміра Андрэевіча Калесніка з Калеснікаўскага цэнтра пры Брэсцкім універсітэце. Гэта мой былы выкладчык у пэдінстытуце, які прывіў любоў да беларускай літаратуры. Тады ён даследаваў творчасць Максіма Танка.

Таксама маю цудоўную кнігу «Скідзель і яго ваколіцы». Скідзельшчына — гэта мая Радзіма, я заканчвала скідзельскую школу. Кніга напісана паводле дакументальных матэрыялаў. У кожным рэгіёне павінна быць створана такая кніга. Можа яны і ёсць у многіх.

Не скажу, што ў мяне вялікая бібліятэка, але ёсць шмат кніг, якімі даражу. Сваім дзеткам я заўсёды чытала ўголас розныя апавяданні, казкі, прасіла іх мне пачытаць, і дачка Лена, і сын Віця цэняць кнігі. У дзяцінстве яны вельмі любілі «Дзіцячую энцыклапедыю» ў 12 тамах. Я тады яе выпісала. Не ведаю, чым яна прыцягвала іх увагу. Там жа малюнкаў асабліва не было, а яны прасіць (ставілі гэтыя кнігі на верхняй паліцы кніжнай шафы): «Мама, ну дай нам «пачытаць» (чытаць яшчэ не ўмелі) «анцыю клапедыю». Я ўжо дастаю, папярэджваю, каб ашчадна глядзелі, а яны пры гэтай «анцы» могуць прабавіць час, пакуль вячэра зварыцца.

І я вельмі задаволена, што мой праўнучак Мікітка, яму пяты гадок, любіць слухаць, калі яму чытае мама ці бабуля. Цяпер дзеці маюць шмат цікавых кніг і часопісаў. Мая дачка нядаўна купіла Мікітку кнігу «Цела чалавека». Яна ў форме азбукі, тэкст там невялікі, але кніга багатая на каляровыя ілюстрацыі, пад якімі нешматслоўныя простыя тлумачэнні. Кожны вечар яны чыталі па адным развароце кнігі, і хлопчык паўтараў, пра што напісана.

Кніга — неацэнны дар чалавеку і нішто яе не заменіць. Ні тэлевізар, ні камп'ютар. Яна была, ёсць і будзе заўжды духоўнай скарбніцай чалавека. Вельмі добра, што ў нашай краіне кожны год і ў розных гарадах адзначаецца свята беларускага пісьменства.

Чытайце і атрымлівайце асалоду ад цікавых тэм і родных слоў. Пакуль мы будзем чытаць і разумець па-беларуску — мы будзем заставацца тымі, хто мы ёсць.

**Яўгенія КУЛЕВІЧ,**
*в. Сялец, Смаргонскі раён.*

# «Мама — сонца, тата — месяц. Абое цудоўныя, але не могуць быць разам...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

*(На кухоннай шафе заўважаю слоік з перцамі чылі.)* **Мая сяброўка Ірына Кабасакал** напісала кулінарную кнігу «Ад перца да сэрца». Гады два таму на нейкім мерапрыемстве яна мне сказала: «Наташа, у мяне ёсць ідэя наконт вокладкі. Патрэбна сукенка з капусты». Я люблю крэатыўныя ідэі, таму адразу ж загарэлася дапамагчы. Ужо пачала сабе ў галаве круціць гэтую капусту. Праходзіць час, тэлефаную Іры: «Ну што, твая кніга ўжо быццам бы гатова. Калі мне пачынаць скупляць капусту?» — «Слухай, я ўжо перадумала, робім сукенку з перцу чылі», пачула ў адказ.

**Самае складанае было знайсці амаль 2000 перцаў чылі.** Яны ўсе мусілі быць аднаго колеру, вызначанай формы. Мы аб'ездзілі ўсе рынкі і гіпермаркеты Мінска. Выкладвалі ў Фэйсбуку, як набываем гэтыя перцы, як лічым, але ніхто не ведаў, навошта *(смяецца)*. Сукенку я зрабіла за два дні. Яна была непад'ёмная, не ведаю, як Іра ў ёй хадзіла.

**Перац чылі вельмі хутка псуецца,** таму частку Ірынай сукенкі адразу ж давялося выкінуць. Усё астатняе я прывезла дадому і высушыла. Некалькі дзён кватэра была насычана водарам перцу чылі. Гэта быў сакавік — якраз сезон грыпу. Паверце, у нас у кватэры ніводнага мікроба не было. У выніку сукенка ператварылася ў 200-літровы мяшок засушаных перцаў. Я сабе на памяць пакінула слоічак. Астатнія аддала Ірыне. Як яна імі распарадзіцца, даведаецеся на прэзентацыі кнігі. Дарэчы, хутка да нас прыедуць прадстаўнікі Кнігі рэкордаў Гінеса, каб зафіксаваць стварэнне сукенкі з 2000 перцаў чылі. Рыхтуемся праславіць нашу краіну на ўвесь свет.



## Пра камандзіроўку ў Кітай, спекуляцыю дзецьмі і сінія валасы

**Я ўмоўна падзяліла сваё жыццё на чатыры роўных часткі.** Дом (усё, што тычыцца ўтульнасці, гатоўкі), сям'я (дзеці, муж, бацькі), работа і я, любімая. Як толькі знаходжу баланс паміж гэтымі чатырма «кітамі», тады ўсё атрымліваецца, усе шчаслівыя. Як толькі пачынаю зацыклівацца на нейкай частцы асобна, тады ўсё ляціць дагары нагамі.

**Перад разводам мы з першым мужам вырашылі пажыць асобна.** Бо была яшчэ нейкая надзея: магчыма, памірымся. А дзецям я сказала, што тата з'ехаў у Кітай у камандзіроўку на паўгода. Але спроба выратаваць сям'ю аказалася няўдалай. Калі прынялі канчатковае рашэнне расстацца, я пагаварыла з дзецьмі — сыну тады было сем гадоў, Эвеліне — тры з палавінай. Сказала, што мама — сонца, а тата — месяц. Яны абое цудоўныя, але не могуць быць разам. І што дзеці ў гэтым невінаватыя.

**Некаторыя мамы забараняюць дзецям бачыцца з татам.** Я ж супраць былога мужа іх не настройвала. Наадварот, ініцыявала сустрэчы. Разумею, што ёсць рэчы, якія толькі тата можа даць сыну і дачцэ. Што датычыцца спекуляцыі дзецьмі, маўляў «ты ніколі іх не ўбачыш» — гэта вялікая памылка жанчын. Дзеці не павінны пакутаваць у гэтай сітуацыі. Пройдзе час, яны вырастуць, пачнуць аналізаваць і не даруюць маці. Пасля разводу прайшло сем гадоў, пакуль мае дзеці мяне ні ў чым не абвінавацілі. Яны падтрымліваюць адносіны са сваім татам і сябруюць з маім новым мужам.

**За апошні год маё жыццё кардынальна памянялася.** Нарэшце я закахалася і другі раз выйшла замуж. Дзяцей сітуацыя задавальняе. Мама шчаслівая. У дачкі з'явіўся сябар, які з ёй паходзіць па крамах, купіць сшыткі ці калготкі. Сын можа пагаварыць з ім на нейкія мужчынскія тэмы. Дзеці ўспрымаюць майго другога мужа як сябра. Я не збіраюся ні ў якім разе рабіць так, каб ён замяняў ім тату. Бо тата заўсёды адзін. А тое, што ён можа даць ім дадаткова любоў ды клопат — гэта толькі двайное шанцаванне маім дзецям.

**Летам Эвеліна папрасіла мяне пафарбаваць ёй валасы ў колер марской хвалі.** Я падумала: а чаму б і не? Гэта ж не дзірка ў языку, а ўсяго толькі валасы. Сама ж некалі такой была. У 16 гадоў пафарбавала сабе валасы ў сіні колер *(смяецца)*. Мы купілі адмысловыя тонікі, якія хутка змываюцца, і навялі прыгажосць. Я сабе за кампанію таксама пафарбавала кончыкі, праўда ў чырвоны колер. У мяне дачка часта выступае на сцэне — спявае, іграе на флейце. Сын з першага класа ходзіць з дзвюма завушніцамі ў вуху. Дзеці такія ж творчыя, як і я, любяць эксперыменты.

**Я сабе ў жыцці паставіла дзве галоўныя мэты:** гарантаваць сваім дзецям бяспеку і здароўе. У астатнім нельга падаўляць іх свабоду. Трэба расказваць, што можа здарыцца ў розных сітуацыях, але выбар пакідаць за імі. Калі пастаянна абмяжоўваць і ўсё забараняць, на даверлівыя адносіны можна забыцца.

## Пра трусінае футра, сямейны герб і скульптара Жбанава

**Бабуля прыязджала да нас у госці заўсёды з двума чамаданамі:** адзін — для мяне, другі — для брата. Абшывала любімых унукаў з ног да галавы. Усе летнія вакацыі я праводзіла ў яе ў Навагрудку. Кожны вечар бабуля штосьці шыла ці перашывала на сваёй старэнькай «зінгераўскай» машынцы. Я ж сядзела побач і з абрэзкаў стварала сукенкі для сваіх лялек. Потым для лялек сваіх сябровак. Дзядуля разводзіў трусоў, і аднойчы я сшыла сваёй Барбі трусінае футра *(смяецца)*.

**Мой тата ўсё жыццё прысвяціў рэстаўрацыі.** Быў час, калі ён ездзіў па вёсках і збіраў элементы беларускага побыту. Аднойчы ўзяў з сабой і мяне. Мы знайшлі ў сваякоў куфар, проста завалены саматканымі тканінамі. Чаго там толькі не было — і ручнікі, і пакрывалы, і абрусы. Мне ўвесь гэты скарб дазволілі забраць. У выніку нарадзілася мая новая калекцыя, якая так і называлася, — «Куфар». Пах сырасці з саматканай тканіны я вывела, але водар даўніны захаваўся. Гэта дадало шарму калекцыі. Яна была, дарэчы, дастаткова сучасная. І на «Млыне моды» ўвайшла ў дзясятку найлепшых калекцый.

**Вельмі люблю рэчы з гісторыяй.** Учора на Ждановіцкім рынку зазірнула на Поле цудаў. Вось гэта мой новы набытак *(паказвае рарытэтную сярэбраную цукарніцу)*. Вельмі дарожу вунь тымі распіснымі французскімі кубачкамі. Іх з набору толькі тры заставалася, дык я апошнія ўхапіла. Хоць яны крыху патрэсканыя, але як падумаю, што, можа быць, якая-небудзь графіня з іх піла, дык на душы цяплей...



«Гэты сямейны герб намалявала мая мама. Ён мне нагадвае, хто я і адкуль».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**У мяне над камінам вісіць герб.** Яго намалявала мая мама. І падарыла мне на 30-годдзе. Гэта адзін з гербаў, якія выкарыстоўвалі Поткіны. Ён мне нагадвае, хто я і адкуль. Недзе ў 90-х гадах мама пачала пісаць кнігу пра сваю сям'ю. Потым натхніла і тату. Ён звярнуўся ў архівы. Аказалася, прозвішча Поткін мае англійскія карані, у нас нават знайшліся сваякі ў Англіі.

**Ганаруся сваім татам.** У мяне нават ёсць адмысловы экскурсійны тур па Мінску для бізнес-партнёраў і сяброў, якія прыязджаюць з іншых краін. Ваджу іх па горадзе і паказваю будынкі ды скульптуры, да якіх прыклаў руку Валерый Поткін. Напрыклад, менавіта яму належыць ідэя ўсталяваць каля Ратушы бронзавы «Экіпаж», на плошчы Незалежнасці — «Дойліда». Менавіта дзякуючы яго настойлівасці на «Варотах Мінска», што на Прывакзальнай плошчы, аднавілі скульптуры салдата, інжынера, калгасніцы ды партызанкі. Што цікава, інжынера славуты скульптар Уладзімір Жбанаў зрабіў падобным на майго тату. Праўда, ён у мяне не такі стройны, але твар пазнавальны. Не ведаю, які я ў жыцці след пакіну, але мой тата, канешне, «наслядзіў» канкрэтна.

**Тата са Жбанавым не толькі супрацоўнічалі, але і сябравалі.** Агульныя праекты ствараюцца, калі людзі на адной хвалі, калі яны адно аднаго адчуваюць. Літаральна на выхадных мы ўсёй сям'ёй наведвалі яго магілу. Бачу, што тата вельмі перажывае. Гэта быў адзін з самых блізкіх людзей у яго жыцці.

## Пра спартыўныя шкарпэткі, 35-ы памер абутку ды патрэбу дзяліцца

**Учора сустрэлі з мужам жанчыну, якая надзела спартыўныя шкарпэткі з туфлямі на абцасах.** Мы ледзь стрымаліся, каб не засмяяцца. Мне пашанцавала: мама мала таго, што сама паказвала прыклад, дык яшчэ і аддала мяне ў 13 гадоў у школу Сашы Варламава, а ў 16 гадоў у школу прыгажосці Лікі Ялінскай (Анжалікі Агурбаш). Там былі педагогі, якія прывілі пачуццё густу, любоў да сябе, навучылі этыкету, догляду за сабой.

**У Мінску хапае мадэльных школ.** Але ж не кожная дзяўчына марыць быць мадэллю. Таму важна, каб была школа, дзе раскажуць, як быць прыгожай дзяўчыне любога росту і дастатку. Якраз такую школу прыгажосці мы з сяброўкай думаем адкрыць.

**Як любая жанчына, я люблю прыгожыя рэчы.** Маю вельмі шмат сукенак і туфелькаў. Але большасць з іх не затрымліваецца ў мяне надоўга. Шмат свайго адзення, у тым ліку і з уласных калекцый, аддаю дзецям з праблемных сем'яў. У мяне ж маленькі рост, нашу 35-ы памер абутку.

**У маім жыцці быў перыяд, калі я толькі брала.** Цяпер адчуваю патрэбу аддаваць, бо ўжо ёсць чым падзяліцца. З задавальненнем удзельнічаю ў дабрачынных праектах. Стараюся дапамагаць менавіта дзецям. Прычым грошы тут, як правіла, не асноўнае. Важней запоўніць пустату, чамусьці навучыць.

### БЛІЦ-АПЫТАНКА

***— Вы ствараеце сцэнічныя вобразы для Іскуі Абалян, Анжалікі Агурбаш, Наталлі Падольскай, Паліны Смолавай. Для каго з замежных зорак марыце штосьці пашыць?***

— З задавальненнем стварыла б які-небудзь вобраз для Мадонны. Двойчы была на яе канцэртах. Мне падабаецца яе правакацыйны стыль.

***— А для мужчын?***

— Напэўна, для балета Мадонны *(смяецца)*. Я мала працую з мужчынамі.

***— Ці хацелі б самі выйсці на подыум?***

— Дэманструю адзенне ў жыцці. На ўсіх вечарынках у асноўным я ў сукенках свайго дызайну. Што датычыцца подыума, там ёсць вызначаныя стандарты. Я пад іх не падыходжу са сваім маленькім ростам. Праўда, некалькі гадоў таму прыняла ўдзел у дабрачынным паказе чырвоных сукенак. Вельмі хвалявалася. Звычайна я па іншы бок подыума. А тут трэба было не проста прайсціся, а пранесці ідэю мерапрыемства: мы збіралі грошы на лячэнне дзяцей з парокам сэрца. Сукенку адмыслова для гэтага мерапрыемства шыла, вобраз прыдумала, каб адпавядаў майму лёгкаму гульліваму ўнутранаму свету і ў той жа час нагадваў пра любоў да бліжняга.

***— Калі б вы былі на маім месцы, якое пытанне задалі б сабе ў якасці апошняга?***

— Такога пытання мне яшчэ ніхто не задаваў *(задумваецца)*. Напэўна, пра планы на будучыню. Я творчы чалавек. У мяне заўсёды вельмі шмат новых праектаў у галаве. Нядаўна адкрыла свой канал на YouTube. Называецца «Школа моды Наташы Поткінай». Буду здымаць у асноўным ролікі пра тое, як дзецям пашыць сабе нейкае адзенне. Магчыма, камусьці такім чынам дапамагу развіць творчыя навыкі, наблізіцца да сваёй мары. Ну, і асноўны мой праект — будаваць светлую будучыню разам з новым мужам.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
*nadzieja@zviazda.by*

■ Нататкі таткі



# Прывітанне ад прабабулі,
## або Хварэць забараняецца

**Нашай сям'і пашанцавала. Мне на рабоце прапанавалі дзіцячую пуцёўку ў адзін «казырны» санаторый. Больш за тое, яе давалі задарма. Заставалася толькі ўзяць адпаведную даведку аб тым, што дачка мае патрэбу ў аздараўленні. Але ў паліклініцы нам адмовілі. А ўсё таму, што за апошнія шэсць гадоў малая не звярталася па дапамогу лекараў. Не хварэла яна ні на грып, ні на ангіну, ні на што... Так што засталіся мы без пуцёўкі...**

Гэта было гадоў восем таму. Старэйшая дачка вырасла. Падрастае сярэдняя і малодшы сын. Не скажу, што мае дзеці ўвогуле не прастуджаліся. Але яны хварэюць у некалькі разоў менш чым суседскія. І гэта факт.

Сакрэт у тым, што кожны год позняй восенню я гатую беларускі «антыпрастудзін». Так гэты цудадзейны сродак называла мая бабуля Таня. Менавіта яна і пакінула каштоўны рэцэпт мне і маім дзеткам.

Ну, паехалі! Бяром чорную рэдзьку сярэдніх памераў (не маленькую) і мыем. Разразаем яе амаль напалову з боку хвосціка. Потым вельмі акуратненька выразаем сярэдзіну рэдзькі, яе нутро. Робім гэта так дакладна, каб, калі прыкладзём другую палову з хвосцікам, у нас атрымалася зноў цэлая рэдзька. А цяпер бяром тры сталовыя лыжкі мёду і кладзём у падрыхтаваную пустую сярэдзіну рэдзькі. Затым у нас пачынаюць дзейнічаць працэсы дыфузіі і прыроднай хіміі. Мёд уступае ў рэакцыю з мякаццю рэдзькі і робіцца такі празрысты залацісты напой. Мёд выцягвае ўсе сокі з гародніны не імгненна, а за два-тры дні. Таму я бяру рэдзьку, стаўлю ў глыбокую міску — і ў халадзільнік.

Потым пераліваю напой у невялічкі слоічак і «антыпрастудзін» гатовы. Цяпер засталося, мабыць, самае складанае. Трэба ўжываць гэты напой як сапраўдныя лекі — пакрысе. У мяне адной добрай рэдзькі хапае на чатыры дні. Даю дзецям па адной чайнай лыжачцы раніцай да снядання і па адной перад сном. Каб цалкам падрыхтаваць малых да халадоў, спатрэбіцца мінімум 3—4 рэдзькі.

## Бутэрброды і дэсерт выхаднога дня

А яшчэ у суботу і нядзелю мы зімою робім бутэрброды а-ля агонь. Для іх бярэцца часнок (колькі не шкада), чысціцца і крышыцца вельмі дробна. Потым на той жа часночніцы здрабняем 50—100 грам цвёрдага сыру. Змешваем сыр, часнок і маянэз. Падрыхтаваную сумесь намазваем на невялікія кавалачкі белага хлеба і зверху кладзём палоску ківі. Проста? Так, але часнок у такой рэцэптуры чысціць усе «дзіркі» твару і дыхаць потым лягчэй.

Акрамя таго, я часцяком раблю ў суботу просты дэсерт, які ўзмацняе імунітэт. Змешваю жменю грэцкіх арэхаў, палову цвёрдага яблыка, падзёртага на сярэдняй тарцы, і адну сталовую лыжку мёду.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ПАЎСОТНІ ХВАСТОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



Кацяняты з лесу хутка сталі ручнымі.

Туды дзеці прывялі знясіленую аўчарку, бо не змаглі пракарміць. А другі пастаялец — гэта метыс аўчаркі Герда. Яніна знайшла яе скалечанай і забрала дадому. Верагодна, жывёла трапіла ў пастку: ад лапы засталася толькі голая костка. Гэта быў снежань, Герда замярзала на вуліцы. На той момант уся ветэрынарная дапамога была для Яніны ў навінку, але лапу ўдалося выратаваць. Калі Гердзе стала лепш, яе перасялілі ў вальер.

Цяпер Яніна ўжо амаль профі па медыцынскай частцы — ведае, як лячыць усе тыповыя захворванні, сама робіць уколы, праводзіць прафілактыку ад блох. Адзінае, як прызнаецца, не навучылася яшчэ ставіць кропельніцы. А калі патрэбна стэрылізацыя, яна звяртаецца да мазырскага ветэрынара. Насамрэч, па ўласным досведзе скажу, нават у сталіцы знайсці добрага спецыяліста даволі цяжка. А ў раённых ветстанцыях часам большае, на што здольныя ўрачы, — патравіць глістоў.

Да таго, як сысці ў дэкрэт, Яніна займалася сабакамі сама. Іх было тады менш. Потым стаў дапамагаць брат, перш за ўсё, фізічна: кожны дзень ён развозіць ваду і разносіць мяса. Яніна цяпер больш займаецца са шчанюкамі. У гэтым ёй дапамагае дачка Алісія. Разам з маці дзяўчынка штодзень наведвае прытулак і перажывае за кожнага гадаванца.

Дома ў Яніны кот, кошка ды сем сабак. Шасцёра з іх — былыя бяздомныя, адзін — бацькоўскі ратвейлер. Раней бацькі заўсёды трымалі па два ратвейлеры, але цяпер месца ў хаце і ў сэрцы занялі выратаваныя жывёлы.

Яшчэ ў Яніны жывуць восем кацянят, якіх знайшла ў лесе яе маці. Нехта туды іх прывёз і пакінуў. Цяпер кацяняты жывуць у невялікай драўлянай прыбудове. Раней іх зачынялі ў гаражы на ўвесь час, каб не збеглі. Але некалькі дзён таму да нашага візіту нехта сунуў свой нос у гараж, а малыя, з'явіўшыся на вуліцы, не разбегліся. У планах Яніны зрабіць гадаванцам пляцоўку для гульняў і паліцы для ляжанак.

## Сабака — не рэч...

Яніна ведае лёс кожнага сабакі са свайго прытулку. Гэтым летам, напрыклад, падабралі Пуму. У вёсцы, 20 кіламетраў ад Лельчыц, нехта выкінуў шчаня лайкі. Людзі патэлефанавалі Яніне. «Калі я прыехала, сабака быў у страшнай яме і не мог хадзіць — змарнелы, з атрафіяй мышцаў, ды і яшчэ адзічэлы. За некалькі месяцаў Пума ад'елася і стала даволі вялікай, але да чалавечых рук так і не прывыкла».

**«Цяжка было, калі я адкрыла групу «УКантакце» аб страчаных і знойдзеных сабаках і ўбачыла пост пра свайго шчанюка, якога аддала новым сталічным гаспадарам. Ён стаіць у цэнтры Мінска, а я за 350 км, і гэта ў 22 гадзіны вечара».**

Некаторых сабак прыходзіцца лавіць месяцамі, іншых уласныя гаспадары самі падкідваюць у прытулак. Так тут апынулася Лакі, якую ноччу запёрлі ў адзін з вальераў. Чорную Абі падабралі, калі яна ўжо прымерзла да лёду. Ехаў брат раніцай на работу і ўбачыў, што на прыпынку брэша сабака. Увечары Яніна разам з братам завітала на гэтае месца, каб праверыць, што здарылася: «Прыязджаем, таго сабакі ўжо не было, а пад лавачкай свецяцца вочы. Гэта была Абі, напэўна, яе збілі раніцай. Яна была ўся ў крыві, прымерзлая да прыпынку. А той сабака, якога брат бачыў раніцай, аказваецца, стаяў там цэлы дзень, клікаў на дапамогу. Потым высветлілася, што ў Абі быў пераламаны таз. Яна трохі прыкульгвае і цяпер».

Ёсць у Яніны адзін сляпы сабака. Ён у свой час зрабіў падкоп у вальеры і перабраўся да суседа. Зараз яны жывуць разам, але, паглядзеўшы на гэтага сабаку, разумееш, што ён сябе нейкім не такім не адчувае — ужо прызвычаіўся. А прывезлі яго з Мінска — запалоханага. Ён на вуліцы біўся галавой аб машыны і спаў пад праліўнымі дажджамі. Галава была разбітая, вуха адарвана. Бачна, што з яго здзекаваліся. Ён дагэтуль баіцца мужчын, калі чуе голас або пах.

Сярод дварнякоў выдзяляецца Тоні — гэта вялікі прыгожы пародзісты ганчак. Падабралі яго на дарозе. Ён амаль падаў, яго ледзь не збіла машына. Калі Яніна адчыніла дзверы сваёй легкавушкі, ён залез і кампактненька ўлёгся на пярэдняе сядзенне. У прытулку ад'еўся — і стаў ладным сабакам. Выкінулі яго як адпрацаваны матэрыял з-за немагчымасці дапамагаць на паляванні: у Тоні выпалі амаль усе зубы.

Жыве ў прытулку і цэлая сям'я з лісінай нары. Сабаку Нору выгналі з хаты, калі даведаліся, што яна цяжарная. Вось яна і знайшла для сваіх шчанюкоў схованку. Ля нары іх выпадкова ўбачыла Яніна, пэўны час прывозіла ежу: першапачаткова маці не падпускала блізка да малых, таму брала кавалкі і адносіла шчанюкам, а сама не ела. Калі пачаліся дажджы, Нора адвяла малых да сваёй былой хаты. Там іх і забрала Яніна, бо былым гаспадарам яна ўжо была не патрэбна.

## Энерджайзеры шукаюць новы дом

Калі мы прыехалі ў прытулак, адзін з сабак гуляў па тэрыторыі. Аказваецца, напярэдадні таварышы, з якімі ён разам жыве ў вальеры, зрабілі падкоп. Усе пагулялі, панасіліся за плотам і вярнуліся дамоў. А ён застаўся, і цяпер не даецца ў рукі.

Па нечаканым супадзенні суседзямі прытулку з'яўляецца арганізацыя па адстрэле сабак. Па сутнасці, калі б не Яніна, усімі жывёламі заняліся б менавіта гэтыя суседзі, бо дзяржаўнага прытулку ў раёне няма. Але не гэта страшна. Справа ў тым, што сабакі па-за вальерам выбягаюць на дарогу, а там моладзь носіцца на машынах так хутка, што, на жаль, некаторыя ўцекачы так і застаюцца на тым асфальце...

У прытулку шмат дарослых сабак, якім не так лёгка знайсці гаспадара. Яніна ўжо пагаджаецца, каб яны засталіся ў яе, але малыя шчанюкі актыўна шукаюць сабе новы дом. Асабліва прывабныя тры энерджайзеры, якія на ляту скачуць на рукі і лашчацца нават да незнаёмых людзей.

